

АЙБАЛІТ ЖЫВЕ Ў ЛІДЗЕ

6

У ДЭКАЛЬТЭ ГАЛОЎНАЕ НЕ ПРЫГАЖОСЦЬ

19



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 верасня 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 184 (29553)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ШУМІЛІН, старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях:**

*«Ключавой асаблівасцю дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця Беларусі на 2021—2025 гады з'яўляецца сістэмная пераарыентацыя інавацыйнага развіцця краіны з трансферу замежных тэхналогій на ўкараненне айчынных распрацовак. Такі падыход адпавядае найлепшаму сусветнаму вопыту і актуальны ва ўмовах санкцыйных абмежаванняў з боку дзяржаў, якія выступаюць традыцыйнымі донарамі высокіх тэхналогій. На пачатак мінулай праграмы 33 праекты з 75 былі заснаваны на беларускіх тэхналогіях, а да канца пяцігодкі такіх праектаў налічвалася ўжо 64. Падобныя падыходы выкарыстоўваюцца ў Фінляндыі, Ізраілі. Яны ў першую чаргу канцэнтруюць рэсурсы на тым, што выпрабляецца ўнутры краіны. Сёння гэта актуальная тэма і для Беларусі. Мы будзем укладваць рэсурсы ў нашу навуку, у нашы тэхналогіі і распрацоўкі».*

# БУСЛЫ ЗАСТАЮЦЦА ЗІМАВАЦЬ



**У былым мястэчку Уселюб Навагрудскага раёна сёлета леталі і выводзілі птушанят пятнаццаць пар буслоў. Пра гэта дакладна ведае мясцовы жыхар Васіль ЗДАНОВІЧ. Ён, як сапраўдны арнітолаг, вывучаў гнездаванні і вёў «перапіс» белакрылых сем'яў. Акрамя цікаўнасці да братоў нашых меншых, Васіль Ціханавіч і сам стварае прыгожыя і надзвычай экспрэсіўныя — у руху — фігуры звяроў і птушак. Асабліва падабаецца яму майстраваць сімвал нашай краіны — бусла. Нездарма над падворкам уселюбца не першы год «кружацца» ажно пяць (праўда, двое з іх «пасуцца» на лужайцы перад домам) чырванадзюбых і цыбатых, так падобных на жывы арыгінал, буслоў.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Першы этап рэпетыцыйнага тэсціравання стартуе ў кастрычніку. Яго можна прайсці непасрэдна ў пункце тэсціравання або анлайн.**
- Работнікі гульнявога клуба патрацілі больш за Br10 тысяч з касы на азартныя гульні.
- **Брастаўчанін атрымаў Br870 штрафу за выкінутага з 8-га паверха ката.**

Па сезоне

## КАМУНАЛЬНІКІ ДА ЗІМЫ ГАТОВЫЯ

### А людзі грэюцца і... скардзяцца

**Халодны і дажджлівы верасень ізноў вымусіў прымаць рашэнне аб падключэнні цяпла ў садках, школах ды кватэрах беларусаў раней за звычайны тэрмін. Амаль па ўсёй краіне сацыяльныя і жылыя аб'екты ацяпляюцца. У Мінску, напрыклад, абаграваюцца ўжо 2,5 тысячы дамоў, а ў Мінскай вобласці прынялі рашэнне абаграваць сваіх жыхароў 11 райвыканкамаў. Да зімы ў Беларусі нарыхтавана, напрыклад, 1,5 млн шчыльных $м^3$ драўнянага паліва і 177,5 тысячы тон саляна-пясчанай сумесі. Адрамантавана 285 тысяч пагонных метраў стыкаў сценавых панэляў і 752 тысячы $м^2$ даху. Тым не менш пашпарты гатоўнасці да зімы цеплакрыніцы, якія абслугоўваюцца камунальнай гаспадаркай, могуць атрымліваць да 30 верасня, і на некаторых аб'ектах пакуль вядуцца работы. Як камунальнікі гатовыя да халадоў, расказалі эксперты.**

СТАР. 3

Разумныя грошы

## Хто выбраў год таму айчынную валюту, аказаўся ў выйгрышы

### Куды ўкласці грошы зараз, каб атрымаць выгаду

**Знаёмства маладых людзей з першымі грашыма адбываецца дзіўным чынам: стыпендыі і заробкі яны імкнуцца імгненна выдаткаваць на нейкія бытавыя мары і жаданні. І толькі праз некаторы час з'яўляецца патрэба назапасіць і захаваць, а яшчэ лепш — прымножыць. Фраза «грошы павінны працаваць, а не ляжаць пад матрацам» вядомая кожнаму. Так што самы час пагаварыць пра тое, які ўклад могуць зрабіць правільна інвеставаныя грошы ў асабісты бюджэт і якія варыянты інвестыцый існуюць.**

### Укладанне грошай — гэта заўсёды рызыка

Любое ўкладанне грашовых сродкаў нясе рызыку рознага ўзроўню. Таму першапачаткова неабходна акрэсліць сабе крытычныя дзеянні, якія не трэба рабіць ніколі. Напрыклад, фінансавыя аналітыкі не раяць укладваць усе апошнія грошы. Гэта не можа быць вялікая частка заработнай платы або гадавая прэмія. Інвеставаць можна толькі свабодныя сродкі — тыя, якія не спатрэбяцца вам для жыццезабеспячэння ў найбліжэйшы час.

Не трэба пачынаць з вялікіх сум. Інвестуйце грошы, якія можаце сабе дазволіць вывесці з асабістага або сямейнага бюджэту без страху апынуцца на мелі. Прыватнае інвеставанне — не азартная гульня, а працэс, які патрабуе ведаў, уменняў і навыкаў, таму вучыцца трэба на невялікіх сумах.

Не выкарыстоўвайце сумнеўныя крыніцы інфармацыі. На жаль, у інтэрнэце вельмі шмат псеўдакарысных сайтаў, якія прапануюць прывабныя, але небяспечныя стратэгіі. Звяртайцеся да афіцыйных крыніц — сайта Нацбанка і беларускай фондавай біржы, парталаў банкаў і эмітэнтаў каштоўных папер. Тым больш што ў сур'ёзных кампаній ёсць зручныя мабільныя дадаткі — такім чынам вы зможаце інвеставаць і назіраць за рухам сваіх грошай у рэжыме рэальнага часу там, дзе вам зручна.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X
21184
9 771990 763008

З першых вуснаў

# «ТРЭБА ЎТРЫМАЦЦА НА ГЭТЫМ УЗРОЎНІ, ЧАГО Б ГЭТА НАМ НІ КАШТАВАЛА»

## У Палацы Незалежнасці абмеркавалі справы ў айчыннай прамысловасці

**Напярэдадні Дня машынабудаўніка з дакладам да Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі былі запрошаны міністр прамысловасці Пётр Пархомчык і профільны намеснік прэм'ер-міністра Юрый Назараў.**

Мінпрам Беларусі сёння прадстаўляюць 220 прадпрыемстваў і 145 тысяч работнікаў. У гэтым годзе сапраўды ёсць з чым павіншаваць ведамства, тым больш перад прафесійным святам. Выраслі рэнтабельнасць, экспарт, знізіліся складскія запасы і колькасць стратных арганізацый. Але на сустрэчы Прэзідэнт, як звычайна, хацеў пачуць не столькі пра дасягненні, колькі пра вырашэнне праблемных пытанняў.

«Перадусім хацеў бы пачуць ад вас аб'ектыўную ацэнку работы Міністэрства прамысловасці за бягучы перыяд, і што мы будзем бачыць пасля заканчэння гэтага года з улікам тых бандыцкіх дзеянняў у дачыненні да Беларусі з боку асобных заходніх партнёраў. Мяне цікавіць не толькі вытворчасць, але, зразумела, і экспарт (гэта валюта), складскія запасы, але перадусім — фінансы», — абазначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік краіны запытаў у міністра, як прайшлі перагаворы на замежных выстаўках, на якіх той пабываў. Асаблівая ўвага — афрыканскаму рынку.

Прэзідэнт адзначыў, што дамовіўся з кіраўніком Расіі Уладзімірам Пуціным развіваць вытворчасць мікраэлектронікі. «Якая ў нас тут сітуацыя? Дзякуй Богу, мы захавалі гэтыя прадпрыемствы, але, натуральна, нам неабходна ў гэтым плане больш інтэнсіўна развівацца, дадаваць, каб выйсці на канкурэнтны ўзровень з тымі, хто сёння ў свеце «заказвае музыку», — сцвярджае Аляксандр Лукашэнка.

Таксама ў фокусе даклада Прэзідэнту былі тэмы муніцыпальных закупак Расіяй: ці ёсць там праблемы, як сябе паводзяць расійскія калегі пасля дамоўленасцяў на вышэйшым узроўні.

Асабліва Прэзідэнт акцэнтуе: асноўная задача Мінпрама — захаваць дасягнутыя годныя паказчыкі.

«Мы проста не маем права падаць. Трэба ўтрымацца на гэтым узроўні, чаго б гэта нам ні каштавала. Я ведаю, што ва ўрадзе прынялі шэраг рашэнняў па мінімізацыі ўздзеяння санкцый Захаду на эканоміку», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён параіў кіраўнікам паглядзець уважліва на супрацоўніцтва асобных прадпрыемстваў. Па словах Прэзідэнта, у яго ёсць інфармацыя, што некаторыя з іх інфармуюць заходнія краіны, як беларускія ўлады спрабуюць абысці санкцыі.

«Шпіёняць фактычна. Здаюць інфармацыю туды. Некалькіх мы выявілі — сядуць, і надоўга. Гэта я прама кажу. Мы павінны гэта бачыць. Адзінкі такіх яшчэ засталіся. Гэта не проста людзі, што выказваюць сваю грамадзянскую пазіцыю, — гэта людзі, якія свядома, за грошы спецслужбаў Захаду, шкодзяць нашай эканоміцы, а роўна і нашай дзяржаве», — заўважае Аляксандр Лукашэнка.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### Каментарый у тэму

### «Мы будзем здзіўляць»

Па словах **міністра прамысловасці Пятра ПАРХОМЧЫКА,** прадпрыемствы галіны дэманструюць высокія тэмпы росту экспарту (139 %) і ў яго няма сумневу, што такая дынаміка захаваецца па выніках дзевяці месяцаў.

«Дадзена даручэнне — нягледзячы на складанасці захаваць аб'ёмы вытворчасці, экспарту на ўзроўні, дасягнутым за шэсць месяцаў. Фактычна за другое паўгоддзе мы павінны падвоіць вынікі работы прамысловых прадпрыемстваў. Хачу сказаць, што з пастаўленай задачай справімся», — сказаў міністр.

Паводле Пятра Пархомчыка, санкцыі — гэта для прадпрыемстваў штуршок да імпартазамяшчэння.

«Сёння нашы канструктарскія школы вырашаюць такія задачы. Не хацеў бы раскрываць нашы тэхнічныя планы, але мы будзем здзіўляць. Няма сумневу, што з санкцыямі прамысловыя прадпрыемствы Рэспублікі Беларусь справяцца», — заяўляе кіраўнік ведамства.

У графіку міністра шмат замежных камандзіровак. На днях ён вярнуўся з Татарстана, дзе сустракаўся з кіраўніком рэспублікі. Той запэўніў: беларусы атрымаюць заказ на пяцігодку па пастаўках сельгастэхнікі. З Зімбабвэ Пётр Пархомчык летась прывёз кантракты на 30 мільёнаў долараў, пастаўкі захаваліся сёлета. У снежні зноў ляцець у гэту афрыканскую краіну рыхтаваць план работы на 2022 год. Пабываў Пётр Пархомчык у Сербіі. Інтарэс на Балканах выклікала сельскагаспадарчая тэхніка, у попыце — электратранспарт і пажарныя машыны. Добрыя адносіны з расійскімі партнёрамі. Тэмп росту на гэтым рынку за год склаў 52 %.

Такая колькасць заказаў адлюстроўваецца, натуральна, на фінансавых паказчыках прадпрыемстваў.

«За бягучыя восем месяцаў не было выпадкаў, каб прадпрыемствы Міністэрства прамысловасці не выплацілі заработную плату. Заробкі па Міністэрстве прамысловасці — 1350—1400 рублёў. Да канца года будуць у межах — 1400—1450 рублёў. То-бок, трохі падрастуць», — акцэнтуе міністр.

Дэмаграфічная бяспека

# УСТОЙЛІВАСЦЬ І РАЗВІЦЦЁ

## Праз сцвярджэнне традыцыйных сямейных каштоўнасцяў

**Па даных перапісу насельніцтва 2019 года, у Беларусі налічваецца больш за 2612 тысяч сем'яў. «Пытанні сям'і і ўстойлівага развіцця не страчваюць сваёй актуальнасці на працягу многіх стагоддзяў і сёння знаходзяцца ў цэнтры ўвагі сацыяльнай палітыкі дзяржавы. Сям'я — аснова наогул ўсёй дзяржавы. У адпаведнасці з канцэпцыяй нацыянальнай бяспекі і законамі дэмаграфічнай бяспекі, павышэнне прэстыжу моцнай сям'і, фарміраванне духоўна-маральных стандартаў жыцця грамадзян у галіне сямейных адносін з'яўляецца прынцыпова важным кірункам і задачай дзяржавы для дасягнення дэмаграфічнай бяспекі», — лічыць кансультант аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана БЕЛАШ.**

Апошнія сацыялагічныя даследаванні паказваюць, што і для саміх беларусаў характэрная высокая каштоўнасць сям'і: 98 % насельніцтва лічаць сям'ю важнай часткай свайго жыцця. Сям'я — неад'емны атрыбут нашага грамадства, менавіта ў сем'ях пражываюць каля 80 % насельніцтва краіны.

Таксама спецыяліст праінфармавала, што больш за 15 % жыхароў Беларусі ўжо перасягнулі ўзрост 65 гадоў. Прычым кожны чацвёрты з іх — старэйшы за 80 гадоў.

Пакуль яшчэ Беларусь уваходзіць у траціну краін з самым нізкім узроўнем дэмаграфічнага старэння, але, паводле прагнозаў экспертаў, хуткасць старэння будзе павялічвацца, а значыць, павялічыцца і колькасць насельніцтва старэйшага ўзросту.

— Мы павінны разумець, што клопат пра старэйшае пакаленне становіцца выклікам для многіх сем'яў і ўсяго нашага грамадства ў цэлым, — сказала прадстаўнік міністэрства. — Гэта патрабуе кансалідацыі намаганняў як дзяржавы, так і грамадства і кожнай сям'і. Наша задача — не толькі падтрымаць пажылых людзей, але яшчэ і сфарміраваць такое грамадства, якое будзе зручным і камфортным для ўсіх узростаў.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Класныя навіны

# «ІНФАРМАТЫКА БЕЗ РАЗЕТКІ»

**Адукацыйны праект з такой назвай, распрацаваны ў ПВТ, будуць укараняць у дзіцячых садках па ўсёй краіне. Навучальная праграма прайшла экспертызу і атрымала адпаведнае адабрэнне ў Міністэрстве адукацыі. Пра гэта паведамляе сайт Парка высокіх тэхналогій.**

У мінулым вучэбным годзе ў праекце ўдзельнічала больш за дзве тысячы дзяцей і 183 педагога з 85 дзіцячых садкоў па ўсёй краіне. У 2021/2022 годзе «Інфарматыка без разеткі» прыйдзе ўжо больш чым у 200 дашкольных устаноў адукацыі. Асноўная мэта праекта — фарміраванне алгарытмічных уменняў і лагічнага мыслення ў дзяцей ва ўзросце 5—7 гадоў. Дашкольнікаў вучаць структураваць інфармацыю і аперыраваць ёй без выкарыстання камп'ютара. Прычым заняткі праходзяць у гульнявой форме.

— Самая першая праграма была распрацаваная больш за два гады таму. Тады мы думалі, што дзеці ў садку сядуць за парты і будуць вырашаць задачы. Але калі прыехалі ў рэальную групу і паглядзелі, як ідзе апрабацыя праграмы, стала зразумела, што ў пяцігадовым узросце ўсё ж такі адзіны даступны метад навучання — гульнявы. Таму сёння ўся праграма праекта «Інфарматыка без разеткі», якая ўкараняецца ў дашкольных установах, будуецца на гульнявой дзейнасці, — адзначыў **намеснік дырэктара адміністрацыі ПВТ Аляксандр МАРЦІНКЕВІЧ.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Акцэнты

# СУПРАЦЬ АДНАБАКОВЫХ ПРЫМУСОВЫХ МЕР

**Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ прымае ўдзел у 76-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН.**

Учора ён прыняў удзел у міністэрскай сустрэчы краін — удзельніц Групы сяброў у абарону Статута ААН па тэме процідзеяння аднабаковым прымусовым мерам. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага знешнепалітычнага ведамства. Уладзімір Макей прадставіў пазіцыю Беларусі аб недапушчальнасці прымянення такіх мер, як пагрозы для міжнароднай бяспекі і дабрабыту людзей.

Падчас перагавораў у Нью-Ёрку міністр замежных спраў Беларусі сустрэўся з міністрамі замежных спраў Ірана, Нікарагуа, Турцыі, Сербіі і Фінляндыі. У час сустрэчы з міністрам замежных спраў Ісламскай Рэспублікі Іран Хасэйнам Амірам Абдалахіянам бакі пацвердзілі неабходнасць інтэнсіфікацыі ў найбліжэйшай перспектыве беларуска-іранскага гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння, у тым ліку беручы пад увагу сумесныя намаганні дзвюх краін на міжнароднай арэне па процідзеянні палітыцы эканамічнага націску і аднабаковым прымусовым мерам.

Кіраўнікі МЗС Беларусі і Ірана адзначылі супадзенне пазіцый па шэрагу актуальных міжнародных тэм, у першую чаргу адносна праблематыкі незаконных санкцый як метаду палітычнага націску і ўмяшання ва ўнутраныя справы суверэнных дзяржаў. У ходзе размовы Хасэйн Амір Абдалахіян запрасіў Уладзіміра Макея наведаць Тэгеран з рабочым візітам у найбліжэйшы час.

На перагаворах з міністрам замежных спраў Нікарагуа Дэнісам Раналда Манкада Каліндрэсам быў адзначаны высокі ўзровень узаемнай падтрымкі на міжнароднай арэне. Кіраўнік МЗС Нікарагуа падкрэсліў важнасць удзелу Беларусі ў дзейнасці Групы сяброў у абарону Статута ААН і Камітэта па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын. Уладзімір Макей падзякаваў за садзейнічанне ў пашырэнні ініцыятыў Беларусі ў ААН, у тым ліку па процідзеянні гандлю людзьмі.

Бакі таксама ўдзялілі асаблівую ўвагу развіццю эканамічных сувязяў паміж дзяржавамі, актывізацыі работы сумеснай беларуска-нікарагуанскай міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве і павышэнні інтэнсіўнасці кантактаў па лініі знешнепалітычных ведамстваў.

Падчас сустрэчы з міністрам замежных спраў Турцыі Меўлютам Чавушаглу бакі канстатавалі пазітыўную дынаміку двухбаковага супрацоўніцтва, абмеркавалі падрыхтоўку чарговага пасяджэння беларуска-турэцкай сумеснай міжурадавай эканамічнай камісіі, абмяняліся меркаваннямі па актуальных пытаннях міжнароднага парадку дня, уключаючы тэматыку процідзеяння нелегальнай міграцыі. Уладзімір Макей падзякаваў калегу за прынцыповую пазіцыю і дружалюбнае садзейнічанне турэцкага боку на фоне антыбеларускай рыторыкі і дзеянняў з боку шэрагу дзяржаў. Меўлют Чавушаглу пацвердзіў высокую зацікаўленасць Турцыі ў развіцці ўсебаковых адносін з Беларуссю, рэалізацыі буйных эканамічных праектаў у нашай краіне. Ён таксама выказаў удзячнасць беларускаму боку за аказанне важкай дапамогі пры ліквідацыі лясных пажараў на паўднёвым узбярэжжы Турцыі.

З міністрам замежных спраў Сербіі Ніколам Селакавічам былі абмеркаваны стан і перспектывы двухбаковага супрацоўніцтва ў палітычнай і гандлёва-эканамічнай сферах, узаемадзеянне на шматбаковых пляцоўках. Міністры абмяняліся меркаваннямі аб актуальных пытаннях міжнароднага парадку дня, уключаючы сітуацыю ў рэгіёне Заходніх Балкан.

Акрамя таго, шэраг пытанняў у сферы ўзаемнага інтарэсу быў абмеркаваны з міністрам замежных спраў Фінляндыі Пекам Хаавістам.

**Пётр ДУНЬКО.**

Блізкая ўлада

# Выканкамы на сувязі

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 25 верасня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Ігар Мікалаевіч ЧАСНОК. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Леанідавіч ДЗЯДКОЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч КРУЧАНАЎ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Юрый Уладзіміравіч ТРУШЧАНКА. Тэл. 8 017 222 44 44.

# КАМУНАЛЬНІКІ ДА ЗІМЫ ГАТОВЫЯ

### «Зімовыя» пашпарты і перасовачныя кацельныя

*— Работы па цеплавой гаспадарцы і жыллёвым фондзе ў цэлым ужо завершаны, —* расказала **Святлана ЦІМОШКІНА, намеснік начальніка ўпраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.** — *3435 кацельных атрымалі пашпарты гатоўнасці, выдадзены пашпарты і 240 спажыўцам цеплаэнергіі (маецца на ўвазе жылфонд, які абслугоўваюць ЖКГ, і камунальныя кацельныя). Заменена 383 кіламетры цеплосетак, прафілактычна адрамантаваны сістэмы ацяплення ў 41,5 тысячы дамоў, 37,2 тысячы цеплапунктаў у дамах апрэсаваны. Напагатове 15 перасовачных модульных кацельных і 607 аўтаматычных перасовачных крыніц электразабеспячэння. На беларускіх вуліцах гатовы працаваць 3749 адзінак снегаўборачнай тэхнікі. Для папярэджання магчымых аварый у краіне сфарміравана 719 аварыйна-аднаўленчых брыгад (3400 чалавек).*

### Ліквідацыя ды ўлік аварый і настройка градуса

Важна не толькі аператыўна ліквідаваць аварыі, але і не дапусціць іх у будучыні, таму міністэрства сёлета распрацавала метадычныя рэкамендацыі аб парадку збору і перадачы інфармацыі пры ліквідацыі аварый і пашкоджанняў на аб'ектах ЖКГ, засярodзіла ўвагу Святлана Цімошкіна, патлумачыўшы, што ў гэтым дакуменце прапісаны дакладны алгарытм рэагавання на пазаштатныя сітуацыі.

Летась аварый у жыллёвым фондзе падчас падключэння ацяплення не фіксавалася. Былі здарэнні на цеплавых сетках. Па іх выніках распрацаваны сёлетнія планы па замене цеплосетак. Мінсккамунцеплосеткі, напрыклад, планавалі замяніць 54,5 кіламетра (90 % задачы ўжо выканана), расказала **Валянціна ГРЫДЗЮШКА, в. а. намесніка генеральнага дырэктара Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі.**



— Калі адбываецца прарыў батарэі ў адной кватэры, адключаецца адна гэта кватэра або ўвесь стаяк у доме. Рамонт у гэтым выпадку праводзіцца за мінімальны час (на працягу некалькіх гадзін). А вось калі рвецца цеплосетка, то на час рамонту адключыцца ўжо весь квартал, які сілкуецца ад яе. Усе дамы, якія мы падключаем да ацяплення, стараемся разпаветрываць у той жа дзень. Пасля адразу рэгулююцца сістэмы ацяплення.

Многія батарэі на пачатку пуску цяпла могуць быць занадта гарачыя, а некаторыя — здавацца і нібыта халоднымі. Аднак і тыя, і тыя апальваюцца, запэўнілі спецыялісты. Проста адбываецца працэс рэгуліроўкі цеплаНосьбіту адпаведна з тэмпературай за акном.

*— Паслуга цеплазабеспячэння заключаецца ў падтрымліванні пэўнай тэмпературы ў памяшканні. І чалавек плаціць за тэмпературу не ў батарэі, а за тэмпературу ў памяшканні, што з дапамогай гэтай батарэі ствараецца. Якая пры гэтым тэмпература радыятара — не агаворваецца, —* патлумачыў **Андрэй ШУЛЬГА, намеснік генеральнага дырэктара жыллёва-камунальнай гаспадаркі Мінскай вобласці** ў адказ на звароты карыстальнікаў, якія за два дні ўжо паспелі паскардзіцца, што батарэі і занадта гарачыя, і занадта халодныя.

### Мінск гатовы на 100 %, Міншчына даганяе

Аб'ём запланаваных перадзімовых работ у сталіцы цалкам выкананы, а пашпарты гатоўнасці атрымалі 100 % жыллёва-эксплуатацыйных арганізацый. Падчас падключэння ацяплення ў Мінску працуе 82 брыгады (больш за 1000 чалавек), гатовыя аператыўна адрэагаваць на любую аварыйную сітуацыю. А на шыльдах аб'яў сталічных пад'ездаў, дарэчы, вывешаны нумары тэлефонаў дыспетчарскіх службаў ЖЭСаў, каб жыхары маглі ў выпадку чаго дазваніцца да спецыяліста хутчэй і аднačасова разгрузіць службу 115, запэўніла Валянціна Грыдзюшка.

На Міншчыне пашпарты гатоўнасці па цеплаэнергіі і па цеплакрыніцах атрымалі 90 % аб'ектаў, а работы па падрыхтоўцы да зімы выкананы на 100 %, падзялілася **інфармацыяй Тацццяна МУЗОК, начальнік аддзела энергетыкі і паліва ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі, энергетыкі і паліва Мінаблвыканкама:**

*— Вобласць працягвае нарыхтоўваць запасы паліва на зіму: паліўнага мазуту назапашана 99 %, дроў — 90 %. Да 1 кастрычніка будуць створаны ўсе запланаваныя аб'ёмы.*

На балансе ЖКГ Мінскай вобласці знаходзіцца 862 цеплакрыніцы, якія ўсе цалкам гатовыя да нагрузкі ў ацяпляльны перыяд, і 2897 кіламетраў цеплосетак, якія выпрабаваны і таксама гатовы да зімы. 960 з 1052 аб'ектаў сацыяльнай сферы Міншчыны ўжо падключаны да цяпла, як і 1215 з 6236 жылых дамоў, што абслугоўваюцца ЖКГ. З 947 дамоў, дзе арганізаваны таварыствы ўласнікаў і іншыя формы кіравання, абаграваецца 91 жылы будынак, расказаў Андрэй Шульга:

— 6236 жылых дамоў Міншчыны ў гэты сезон атрымалі свой аб'ём работ. Адрамантаваны 342 балконы, каля 14,5 тысячы пагонных метраў стыкаў сценавых панэляў, 40 тысяч м² даху. Нарыхтавана 25 800 тон пясчана-салянай сумесі для апрацоўкі дарог 480 адзінкамі тэхнікі. Створана 119 аварыйна-аднаўленчых брыгад (650 чалавек). Гатовы да работы тры блочна-модульныя кацельныя ў Мінскім, Маладзечанскім і Дзяржынскім раёнах. У прадпрыемстваў ёсць 104 перасовачныя энергакрыніцы.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Слова дэпутата

## «НЕ ТРЭБА ЗАБЫВАЦЬ ГІСТАРЫЧНЫЯ ФАКТЫ!»

**Ірына ПАЛЯКОВА, дэпутат Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па аграрнай палітыцы:**



— Калі заходнія землі цяперашняй Беларусі знаходзіліся пад кіраваннем польскай улады, у беларусаў не было перспектыў, бо ў выніку паланізацыі нашы продкі і адпаведна мы потым маглі страціць мову, культуру. Працэс уз'яднання, які адбыўся ў 1939 годзе, стаў выратаваннем для нацыі.

Для мяне новае свята, якое мы ўпершыню адзначылі сёлета, — Дзень народнага адзінства — вельмі важнае, таму што гэта напамін пра неабходнасць рабіць высновы з урокаў гісторыі. Ацэнка падзей мінулага — пасыл у будучыню.

Асабліва важна данесці праўдзівую інфармацыю для моладзі і тых, каму, на жаль, не зразумела, што трэба беражліва захоўваць тое, што маем. Трэба станавіцца плячо ў плячо, каб абараніць крохкі мір, незалежнасць, улічваючы сённяшні ціск палітычнага, эканамічнага характару на Беларусь з-за мяжы. Мы абавязаны разам супрацьстаяць знешняму ўмяшанню. Гэта магчыма, калі будзем рабіць усё па прынцыпах адзінства, салідарнасці, узаемнай дапамогі. Галоўнае — захаваць народ, гістарычныя каштоўнасці і традыцыі. Трэба зрабіць усё магчымае, каб адстаяць сваю любімую Беларусь.

Грамадзянам трэба навучыцца паважаць адно аднаго, бо адзінства і мае гэта на ўвазе. Штогод Беларусь робіць упэўненыя крокі наперад, каб быць утульнай для жыцця і прывабнай для гасцей, інвестараў.

Мэтай ва ўсіх нас адна: каб краіна станавілася яшчэ больш моцнай, незалежнай і квітнеючай!

**Запісаў *Аляксандр* ПУКШАНСКІ.**

Шок

# ПОЛЬСКІЯ СІЛАВІКІ ВЫКІДВАЮЦЬ ХВОРЫХ І ЗНЯСІЛЕНЫХ БЕЖАНЦАЎ, ЦЯПЕР — І ДЗЯЦЕЙ

## Пра гэта паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце

**Пагранічны нарад заставы «Падліпкі» Гродзенскай пагрангрупы выявіў на лініі беларуска-польскай граніцы двух знясіленых бежанцаў, грамадзян Ірака. «Як высветлілася пазней, яны браты. Адзін з мужчын практычна не мог перасоўвацца, паколькі, з яго слоў, падчас знаходжання ў Польшчы сур'ёзна пашкодзіў ногі. Аценіўшы сітуацыю, беларускія пагранічнікі выклікалі хуткую медыцынскую дапамогу», — распавялі ў ДПК.**

Неўзабаве на ўчастку гэтай жа заставы была выяўлена яшчэ адна група з шасці бежанцаў: жанчына і хлопчык да 5 гадоў — грамадзяне Конга, і чацвёра грамадзян Ірака, у тым ліку двое дзяцей 5 і 12 гадоў. У абодвух выпадках пры выяўленні груп бежанцаў на лініі граніцы на польскай кантрольна-следавай паласе былі відавочныя сляды выцяснення замежнікаў на беларускі бок, а на пагранічнай тэрыторыі знаходзіліся сілавікі.

Брыгада хуткай медыцынскай дапамогі, якая знаходзілася на ўчастку, пры аглядзе другой групы бежанцаў выявіла ў хлопчыка з Конга траўму ладыжкі, верагодна, атрыманую пры пераадоленні польскіх загарод на лініі граніцы, а ў дзяцей з Ірака — прыкметы пераахаладжэння, абязводжвання і, магчыма, атручэння. Абедзве групы бежанцаў дастаўлены ў Гродзенскую абласную клінічную бальніцу, дзе ім аказваецца неабходная медпамога. Паводле ацэнкі медыкаў, стан дзяцей ацэньваецца як сярэдні ступені цяжкасці. Для далейшага абследавання і лячэння яны шпіталізаваны ў педыятрычнае аддзяленне.

Тэрор, які прымяняецца да бежанцаў, абавязкова дрэнна абернецца для Польшчы. Пра гэта ў эфіры «Альфа Радыё» заявіў дырэктар Цэнтра па праблемах еўрапейскай інтэграцыі палітолаг Юрый Шаўцоў. «Я думаю, самая складаная сітуацыя цяпер на граніцы з Польшчай. Гэта звязана з тым, што масы мігрантаў вырашылі ісці наўпрост у Германію праз Польшчу, а не праз дзве краіны, як раней хадзілі (Літва — Польшча — Германія). У Літву і Латвію таксама захоўваецца трафік, але бежанцы пайшлі масава на Польшчу. Гэта рэальная масавасць. Некалькі дзён таму палякі зрабілі справаздачу, што яны завярнулі больш чым 320 чалавек за суткі, — адзначыў эксперт. — Я не хачу ўскладняць, але тыя, каго ловяць і заварочваюць, — гэта далёка не ўсе, хто праходзіць. У Германіі ўжо адлоўліваюць тых, якія прайшлі, і не толькі там. Рэальна паток значна вышэйшы, чым паказвае афіцыйная польская служба».



Фота БелТА.

Юрый Шаўцоў таксама звярнуў увагу на кліматычны аспект міграцыйнай праблемы. «Цяпер адбылося тое, пра што даўно папярэджвалі: надышлі халады, і разам з імі пачалися новыя праблемы — смерці з-за маразоў. Далей, хутчэй за ўсё, сітуацыя ў гэтым плане будзе ўскладняцца», — заўважыў эксперт.

Палітолаг лічыць, што сілавыя дзеянні польскіх пагранічнікаў у адносінах да мігрантаў будуць мець негатыўныя наступствы для самой Польшчы. «Гэта дрэнна павернецца. Усе мы разумеем, што робяць і ў Літве, і ў Польшчы пагранічнікі і звязаныя з імі сілавыя структуры: яны запалохваюць мігрантаў, каб тыя не хадзілі да іх. Ёсць тэрмін «тэрор». І вось гэты тэрор, які выкарыстаны ў адносінах да бежанцаў, абавязкова дрэнна абернецца для Польшчы», — лічыць Юрый Шаўцоў.

**Пётр ДУНЬКО.**

**Тым часам**

### Крымінальная справа

**Следчы камітэт распачаў крымінальную справу па факце выяўлення на беларуска-польскай граніцы збітага замежніка. Пра гэта паведамілі ў аддзеле інфармацыі і сувязі з грамадскасцю СК.**

«Увечары 21 верасня ў праваахоўныя органы паступіла паведамленне аб дастаўленні ў рэанімацыйнае аддзяленне ўстановы аховы здароўя 19-гадовага грамадзяніна Ірака. Цяжкасць стану, па першапачатковых звестках, звязана са шматлікімі цялеснымі пашкоджаннямі. Следствам устаноўлена, што малады чалавек быў знойдзены супрацоўнікамі пагранічнай заставы ў межах паласы беларуска-польскай граніцы ў цяжкім стане з прыкметамі пераахаладжэння і абязводжвання», — распавялі ў СК.

Прыйшоўшы ў прытомнасць, мужчына змог расказаць, што з тэрыторыі Польшчы яго выправадзілі з прымяненнем фізічнай сілы ўзброеныя людзі ў форме. Следчымі праведзены агляд месца здарэння, апытаны пацярпелы, дапытаны супрацоўнікі заставы, якія выявілі мужчыну. Прызначана судова-медыцынская экспертыза, якую праводзяць спецыялісты ДКСЭ, для ўстанаўлення ступені цяжкасці цялесных пашкоджанняў. Плануецца правядзенне допыту пацярпелага з удзелам перакладчыка.

Па дадзеным факце Свіслацкі раённы аддзел Следчага камітэта распачаў крымінальную справу па ч. 3 арт. 159 (наўмыснае пакіданне ў небяспецы) КК. Праводзіцца расследаванне.

# Хто выбраў год таму айчынную валюту, аказаўся ў выйгрышы

### Спачатку лепш укладваць у сябе

У сваё здароўе, адукацыю, знешні выгляд, асобаснае развіццё. Гэта адзін з самых бяспройгрышных варыянтаў укладання — бо, стаўшы найлепшай версіяй сябе, вы не проста зменіце якасць і ўспрыманне жыцця, але і зможаце больш зарабляць.

Так, заснавальнік вядомага аўтаканцэрна Генры Форд свае першыя сур'ёзныя грошы выдаткаваў на дарагі касцюм, каб здавацца прэзентабельным у вачах партнёраў і работадаўцаў. Шлях такога інвеставання — набыццё і чытанне кніг, атрыманне дадатковай адукацыі, заняткі ў спартзале, змяненне звычак харчавання і іншыя паляпшэнне сябе. Рызыка адна — ваша лянота і няўменне распарадзіцца сваім патэнцыялам.

### Банкаўскія ўклады

Мабыць, самы папулярны і зразумелы спосаб укладання грашовых сродкаў: вы прыносіце суму ў выбраны банк, выбіраеце тэрмін, працэнтную стаўку і ўмовы, а ў канцы тэрміну забіраеце грошы.

Банкаўскія дэпазіты — гэта доўгатэрміновы, але цалкам прымальны праект. Мы нічым не рызыкуем, таму што абсалютна ўсе банкі застрахаваныя на любы выпадак жыцця і вашы грошы змогуць вярнуцца да вас. Калі разглядаць сітуацыю з пазітыўнага боку, то вы будзеце мець стабільны, хоць і невялікі прыбытак.

Як ні дзіўна, але памер даходу напрамую залежыць ад валюты, у якой мы збіраемся захоўваць зберажэнні. Адгадаць, што будзе больш устойлівым: долар, еўра, рубель або швейцарскі франк — цяпер вельмі складана.

Некаторыя фінансісты прыводзяць залатое правіла укладанняў — не класці ўсе яйкі ў адзін кошык. Рэкамендуецца 60 % укладаў трымаць у айчыннай валюце, па 20 % — у доларах і еўра. Існуюць розныя прагнозы аб тым, што долар можа абрынуцца, але, ва ўсякім выпадку, зрабіць гэта не так ужо і проста, таму што гэта міжнародная рэзервовая валюта. Таму можна ўкласці грошы і ў долар, і еўра, а можна — і ў рублі. Варта паспрабаваць пашукаць і іншыя ўстойлівыя валюты. Але ўсе валюты сёння не гарантуюць захаванасць зберажэнняў на 100 %.

Да таго ж мы цяпер назіраем доўгі працэс умацавання беларускага рубля і зніжэнне дэвальвацыйных чаканняў насельніцтвам. Таму цікавасць да дэпазітаў непасрэдна ў доларах расці не можа. І, магчыма, нават ідзе невялікі паток грошай насельніцтва з замежнага сектара банкаўскіх дэпазітаў у айчынны.

Калі вы не збіраеце грошы для паездкі ў Еўропу, тады трэба выбіраць валюту для інвестыцый, дзе самая маленькая маржа (розніца паміж купляй і продажам банкнот). У нашых беларускіх рэаліях гэта якраз долар. Але не варта забываць, што самыя вялікія працэнты па ўкладах прысутнічаюць менавіта ў рублёвых дэпазітах. І яшчэ нагадаю, што курс долара нязменна стаяў на адным месцы на працягу амаль двух з паловай гадоў, аж да лета мінулага года.

### За год па рублёвых дэпазітах — даход салідны

У канцы жніўня 2020 года курс долара да беларускага рубля быў 1 да 2,65. На працягу года рубель неадназначна ўмацоўваўся і падаў, але цяпер ён досыць працяглы час адваёўвае страчанае. Цяпер наш рубель упэўнена стаіць каля «адсечкі» ў 2,5 за долар. І нават умацоўваецца далей.

Калі меркаваць, што ў жніўні мінулага года чалавек прадаў долары і паклаў грошы на рублёвы дэпазіт, то на сёння ён мае вельмі важкі «навар» — 17 % у валюце. Па рублёвых укладах тады існавала максімальная стаўка — 15 % гадавых плюс 2 % за кошт умацавання рубля.

У цяперашніх знешнеэканамічных умовах нашай эканоміцы грошы неабходныя яшчэ ў большай ступені, чым год таму. Таму ўсе банкі істотна паднялі свае стаўкі і ў рублях, а таксама ў валюце. І зарабіць у рублях цяпер можна яшчэ больш.

Напрыклад, з другога тыдня верасня найбуйнейшы банк краіны павысіў працэнтныя стаўкі па нанава прымаемых тэрміновых банкаўскіх укладах у беларускіх рублях. Самы папулярны ўклад «Ураджайны Безадзыўны» на тэрмін 13 месяцаў — 19,73 % гадавых (стаўка крэдыту авернайт Нацыянальнага банка (далей — СКА), сёння яна 9,5 % плюс 9,48 %).

Самы ж выгадны ўклад Беларусбанка «Дзіцячы» Безадзыўны» на тэрмін 5 гадоў — 19,9 % гадавых (СКА плюс 9,65 %) і «Беларусбанк — анл@йн» (безадзыўны) на тэрмін 36 месяцаў — на працягу першых трох месяцаў захоўвання — зыходзячы з фіксаванай працэнтнай стаўкі ў памеры 19,9 % гадавых, а з дня, наступнага за днём заканчэння першых трох месяцаў, — зыходзячы са зменнай гадавой працэнтнай стаўкі ў памеры 19,9 % гадавых (СКА плюс 9,65 %).

Павялічыліся працэнты па валютных дэпазітах, яны сталі ад 2 % да 5,5 %. Павелічэнне значнае, але яно не параўнальнае з 20 % прыбыткам па рублёвых укладах.

І яшчэ. Калі вы паклалі зберажэнні на валютны дэпазіт, і ён праляжаў менш за два гады — будзьце ласкавы, заплаціце падатак. А з рублём мы маем невялікае паслабленне. Падаходны падатак (13 %) будзе ўтрымлівацца з даходаў, атрыманых у беларускіх рублях, — тэрмінам менш за 1 год. Паляжалі вашы крэўныя рублі на рахунках год і адзін дзень — усё, ніякіх падаткаў з працэнтаў плаціць не трэба.

### Калі патрэбна дапамога брокера

Укладваць свае грошы ў куплю каштоўных папер рызыкне не кожны. Праблема ў тым, каб вылічыць, якая кантора стане доўгажыхаром, а якая — матыльком-аднадзёнкам. Для гэтага патрабуюцца спецыяльныя веды, якіх у звычайнага жыхара проста няма, аднак яны маюцца ў брокера або банкіра. Менавіта таму былі створаны спецыяльныя фонды банкаўскага кіравання — формы інвеставання, якая мае на ўвазе аб'яднанне грашовых сродкаў ад розных укладчыкаў і правядзенне розных фінансавых аперацый пад наглядам вопытных фінансістаў.

Напрыклад, дзяржаўныя аблігацыі Міністэрства фінансаў зараз можна набыць на другасным рынку праз структуру «АСБ Брокер». Гэтыя каштоўныя паперы купляюцца кліентамі за беларускія рублі па курсе Нацбанка, з разліку кошту адной аблігацыі роўнай тысячы долараў. Прыбытковасць аблігацыі, стабільная і роўная ад 4 % да 5,5 % гадавых, у залежнасці ад нумара выпуску. Дывідэнды па паперах выплачваюцца адзін раз на тры месяцы.

Дадзеная структура прадае і карпаратыўныя аблігацыі. Наогул, у «скарбонцы» арганізацыі «АСБ Брокер» цяпер прадаецца мноства аблігацый розных прадпрыемстваў і фінансавых кампаній. Гэта і добра вядомыя фірмы і структуры, якія былі створаны нядаўна. Доларавая прыбытковасць гэтых каштоўных папер вар'іруецца ад 6 % гадавых да 11 %. Ёсць там і аблігацыі, намінаваныя ў еўра і беларускіх рублях. Дык вось, максімальная стаўка даходнасці аблігацый у айчыннай валюце роўная 27 % гадавых.

### Нерухомасць заўжды ў цане

Ёсць некалькі варыянтаў: купіць кватэру і здаваць яе, купіць кватэру на стадыі забудовы і прадаць гатовую па ўзрослай цане, укласціся ў рамонт старога жылля і прадаць яго даражэй. Гэты спосаб мае права на існаванне, але пужае шэрагам недахопаў: высокі парог уваходжання (нават на этапе забудовы кватэра каштуе досыць вялікіх грошай); малая ліквіднасць (каб прадаць кватэру выгадна, патрэбны час); рызыкі падману з боку забудоўшчыка.

### Блогі, нэтворкінг і венчурныя інвестыцыі

Існуе маладзёжны спосаб укладвання грошай, які спарадзіў ужо не адзін паспяховы кейс. Можна падарожнічаць, развіваць моўныя навыкі, мець зносіны, весці блог і зарабляць на ім. Дарэчы, блог сам па сабе — таксама навамодны спосаб укладання з невялікім парогам уваходжання. Але тут патрэбны талент, шанцаванне і тая самая big idea, каб не згубіцца ў тэрабайтах інфармацыі.

Інвестыцыі ў нэтворкінг — навамодны шлях інвеставання. Усё проста: купляеце квіткі на стромкія мерапрыемствы, лекцыі, выстаўкі, канферэнцыі, знаёміцеся з патрэбнымі і карыснымі людзьмі, а затым спрабуеце выкарыстоўваць сувязі сабе на карысць — напрыклад, знайсці высокааплатную работу ў сталічных рэгіёнах. Зноў жа, сумнеўны і рызыкоўны спосаб.

Інавацыі і венчурныя інвестыцыі сёння прыцягваюць усіх: ад масцітых алігархаў да прыватных удзельнікаў краўдфандынгавых кампаній. Сапраўды, можна ўкласці ў развіццё тэхналагічнага стартапу або асобны прадукт, але гэта дорага, доўга і вельмі рызыкоўна.

### Навучыцеся казаць «не»

Зусім неапраўдана і нават небяспечна выглядаюць укладанні ў азартныя гульні, латарэі, спартыўныя і іншыя таталізатары, фонды развіцця перспектыўных прэпаратаў і іншае. За ўсім гэтым стаяць разумныя людзі і яшчэ больш разумныя машыны і праграмы, якія знойдуць спосаб пакінуць вас у лепшым выпадку ні з чым, у горшым — яшчэ і з абавязкам.

Але ж і без іх варыянтаў укладання шмат, на любы густ і на любую стартавую суму. Галоўнае — нічога не баяцца, пачаць, не спыняцца ў атрыманні ведаў і вопыту.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Чэхія абвінаваціла ЕС ва ўмяшанні ў перадвыбарчую кампанію ў краіне

**Органы ўлады Еўрапейскага саюза ўмешваюцца ў перадвыбарчую кампанію ў ніжнюю палату парламента Чэхіі, заявіў прэм'ер-міністр краіны Андрэй Бабіш у інтэрв'ю выданню Parlamentnilisty.**

Палітык абвінаваціў дэпутатаў Еўрапарламента ў ціску на Еўрапейскую камісію з мэтай умяшання ва ўнутраныя справы Чэхіі. «Гэта не іх справа! Мы — вольная і суверэнная краіна», — падкрэсліў ён. Бабіш таксама раскрытыкаваў намесніка старшыні ЕК, еўракамісара па пытаннях транспарэнтнасці Веру Юровую. Па словах прэм'ера, уплыў ЕС на ўнутраную палітыку адчуваюць таксама ў Венгрыі і Польшчы.

### Кітай назваў безадказным стварэнне абароннага альянсу AUKUS на чале з ЗША



**Стварэнне трохбаковага абароннага альянсу AUKUS Аўстраліяй, Вялікабрытаніяй і ЗША падрывае рэгіянальную бяспеку і з'яўляецца надзвычай безадказным крокам, заявіў пасол Кітая ў Вашынгтоне Цынь Ган, піша ТАСС.**

Выступаючы на відэаканферэнцыі, арганізаванай фондам Джорджа Буша-старэйшага і цэнтрам Джымі Картэра, кітайскі палітык падкрэсліў, што з'яўленне новага ваеннага альянсу толькі паскорыць гонку ўзбраенняў. На думку Гана, стварэнне AUKUS на чале з ЗША падрывае стабільнасць у рэгіёне, а таксама грэбуе намаганнямі краін па нераспаўсюджванні ядзерных узбраенняў. «Гэта надзвычай безадказна», — падкрэсліў ён.

16 верасня ЗША, Вялікабрытанія і Аўстралія заключылі пагадненне аб абаронным партнёрстве. Кааліцыя атрымала назву AUKUS (Аўстралія, Вялікабрытанія, ЗША). Мэта здзелкі — абарона і адстойванне агульных інтарэсаў бакоў у Інда-Ціхаакіянскім рэгіёне і аб'яднанне намаганняў у сферы развіцця абароннага сектара.

Краіны НАТА заявілі, што перагледзяць сваю стратэгію пасля стварэння AUKUS.

### Штам «дэльта» амаль вычарпаў сябе

**Штам каранавіруса «дэльта», які выклікаў маштабны ўздым захворвання ва ўсім свеце, практычна вычарпаў сябе. Ён працягвае актыўна мутаваць, але гэтыя мутацыі будуць ужо не такімі небяспечнымі.**

Малекулярны біёлаг, доктар біялагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт РАН Сяргей Няцёсаў заявіў, што гэтая версія каранавіруса ўжо прайшла свой пік развіцця. Многія эксперты сыходзяцца ў меркаванні, што новыя варыяцыі «дэльты» не будуць такімі шкоднымі.

Акрамя таго, павінна знізіцца і заразнасць. Размнажэнне новых версій віруса будзе ісці больш павольна, і гэта адаб'ецца на яго актыўнасці, растлумачыў эксперт.

## Надвор'е
## ЦЁПЛЫ ДОЖДЖ...

### А з наступнага тыдня — суха і замаразкі

**Быццам бы ўсё супакоілася. Цыклон «Роланд», які амаль тыдзень залівае нас халоднымі дажджамі, паступова губляе свае пазіцыі. Але гэта не значыць, што ападкі спыняцца.**

У найбліжэйшы час на тэрыторыю нашай краіны занясе актыўныя атмасферныя франты ад наступнага цыклону, які змяшчаецца ў наш бок з Балтыйскага мора, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Таму ў выхадныя будзе дастаткова мокра.

Калі ў пятніцу на большай частцы краіны пройдуць дажджы, у многіх раёнах дастаткова моцныя, то ў выхадныя інтэнсіўнасць ападкаў будзе невялікая. Максімальная тэмпература паветра сёння ўдзень будзе ад плюс 9 градусаў да 15 цяпла. Таксама амаль на ўсёй тэрыторыі краіны будуць ісці кароткачасовыя дажджы і ў суботу. Вецер прагназуецца заходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 4—11 градусаў вышэй за нуль. Удзень будзе ўжо цяплей — ад 10 да 16 градусаў цяпла, па паўднёвым захадзе краіны — да плюс 18 градусаў.

У нядзелю ападкі будуць назірацца ўжо не ва ўсіх рэгіёнах краіны. У гэты дзень месцамі, пераважна па ўсходзе краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Вецер прагназуецца паўночна-заходні, паўднёва-заходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 4 градусаў да 11 градусаў вышэй за нуль. Удзень будзе 11—16 цяпла, па паўднёвым захадзе — да плюс 18 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# «ГАЛОЎНАЕ — ПРАЦАВАЦЬ З ДУШОЙ!»

**Лідзія ГАЛУБЧЫКАВА сярод гомельскіх паштальёнаў чалавек, прама кажучы, легендарны. Сваёй любімай прафесіі яна прысвяціла ўжо 47 гадоў. Нават і сёння, маючы такі вялікі працоўны стаж, Лідзія Сямёнаўна не думае аб выхадзе на пенсію. Кажа, што будзе працаваць, пакуль дазволіць здароўе.**



Нарадзілася і вырасла Лідзія Галубчыкава ў Буда-Кашалёўскім раёне. Там скончыла спачатку васьмігодку, а потым і дзесяць класаў, вырашыла атрымаць прафесію кухара. З гэтай мэтай яна накіравалася ў Віцебск, дзе планавала паступіць у адпаведную навучальную ўстанову. Але вучыцца менавіта па гэтай спецыяльнасці дзяўчынцы забаранілі ўрачы. Сэрца не дазваляла працаваць у памяшканні, дзе трымаецца высокая тэмпература. Што ж, прыйшлося вяртацца на родную Гомельшчыну, дзе сямнаццацігадовая дзяўчынка ўладкавалася на гарадскую пошту ў абласным цэнтры. Амаль увесь час Лідзія Галубчыкава адпрацавала ў 3-м аддзяленні паштовай сувязі Гомеля.

— Участак мне дастаўся не самы лёгкі, — прызналася Лідзія Сямёнаўна. — Шмат у той час было прыватных дамоў, і трэба было іх абысці, ды і сумкі ў паштальёнаў былі больш поўныя. Газеты і часопісы людзі выпісвалі актыўна, вось і даводзілася нам, паштальёнам, і больш хадзіць, і больш насіць. Часам вельмі стамлялася на рабоце.

Па словах Лідзіі Галубчыкавай, самае галоўнае ў гэтай прафесіі — знаходзіць кантакт з людзьмі. Кліенты сустракаюцца розныя, з некаторымі даводзілася праяўляць сапраўдную вытрымку і цярпенне. Але калі да людзей падыходзіць з душой, то і зносіны складваюцца даверныя і ўзаемна ветлівыя. У гэтым яна шмат разоў пераканалася за доўгі працоўны шлях.

Зараз, на думку паштальёна, працаваць стала і лягчэй, і адначасова цяжэй. Быццам і карэспандэнцыі менш, і пенсіі людзі атрымліваюць на банкаўскую картку, але ўчасткі ўзбуйнілі, тэрыторыя абслугоўвання пашырылася. Замест прыватных дамоў узвялі шматпавярховыя будынкі. Напрыклад, сёння ў Лідзіі Сямёнаўны на абслугоўванні 1800 кватэр. Чалавеку ў сталым узросце абысці ўсе дамы няпроста. Але вопытны паштальён на цяжкасці не скардзіцца. Галоўнае для яе — больш рухацца і часцей быць на свежым паветры.

— За гэты вялікі час мне даводзілася працаваць на пошце і аператарам, выконваць абавязкі намесніка начальніка аддзялення сувязі, але я была і застаюся звычайным паштальёнам, чым ганаруся, і ў гэтым бачу сваё пакліканне, — падкрэсліла Лідзія Сямёнаўна. — Калі я рыхтую маладых работнікаў, заўсёды сцвярджаю ім, што ўсё ў іх абавязкова атрымаецца, каб было толькі жаданне працаваць і цярпенне. Ні ў якім разе нельга баяцца цяжкасцяў, трэба іх пераадольваць. Паштальён сёння — гэта і суразмоўца, і псіхолаг, і адначасова сацыяльны работнік. Усіх кліентаў неабходна выслухаць, усім абавязкова дапамагчы. Толькі тады ты сустрэнеш паразуменне і добразычлівыя адносіны з боку людзей.

Як адзначыла начальнік 3-га аддзялення паштовай сувязі Гомеля Тамара Верач, Лідзія Галубчыкава — вельмі адказны і добрасумленны чалавек, сапраўдны майстар сваёй справы. Нягледзячы на ўзрост яна працуе не горш за маладзейшых работнікаў. Для моладзі ўся яе праца — найлепшы прыклад. А яшчэ яна вельмі клапатлівы настаўнік. Дапамагае маладым калегам і словам, і справай. Заўсёды падтрымае, калі чалавек апынецца ў складаным становішчы. Лідзія Сямёнаўна — гонар працоўнага калектыву.

Застаецца дадаць, што хутка, напярэдадні Сусветнага дня пошты, які адзначаецца 9 кастрычніка, Лідзія Галубчыкава будзе ўзнагароджана медалём за доўгую і добрасумленную працу.

**Фота з архіва Гомельскага абласнога філіяла РУП «Белпошта».**

## Падрабязнасці

### ВІНШАВАННІ Ў ЛЮБЫ КУТОК КРАІНЫ

У дзень народнага адзінства наведвальнікі аб'ектаў паштовай сувязі змаглі набыць і падпісаць паштовыя карткі, атрымаўшы магчымасць бясплатна адправіць віншаванні ў любы куток Беларусі сваім родным, блізкім, сябрам. Нацыянальны паштовы аператар бясплатна даставіў маляўнічыя пасланні з добрымі пажаданнямі, якія сталі арыгінальным падарункам да новага дзяржаўнага свята.

### НАШ АГУЛЬНЫ ДОМ

У Дзень народнага адзінства адбылося сапраўднае дзіцячае свята творчасці і мастацтва, якое аб'ядноўвала дзяцей і бацькоў. «Беларусь — наш агульны дом!» — пад такой назвай прайшоў конкурс дзіцячага малюнка ў рамках праекта «Малая радзіма вачыма дзяцей», які праводзіцца РГА «Белая Русь». На конкурс паступіла больш за 50 работ, у тым ліку дзве з першаснай арганізацыі РУП «Белпошта».

Цырымонія ўзнагароджання і выстаўка работ адбыліся ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. Гурткоўцы Цэнтра падрыхтавалі сапраўднае свята нацыянальнай культуры з гульнямі, песнямі, танцамі і музыкай. Падчас свята прайшла цырымонія адкрыцця выстаўкі беларускай выцінанкі «Чароўныя ўзоры».

### РЭГІЯНАЛЬНЫ ФОРУМ

Міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган выступіў з прывітальным словам у рамках рэгіянальнага форуму #GBCregions, які праходзіў 16 верасня ў Гомелі.

I Рэгіянальны форум #GBCregions (Дзяржава. Бізнес. Грамадзяне — рэгіёны) — гэта пляцоўка дэманстрацыі дасягненняў рэгіёнаў у галіне лічбавізацыі розных сфер жыццядзейнасці, а таксама абмеркавання тэм стану, развіцця і перспектыў лічбавай будучыні рэгіёнаў Беларусі.

### ЗА ДРУЖНУЮ СЯМ'Ю!

У Ленінскім раёне г. Мінска адбылося свята «Белая Русь» — за дружную сям'ю! — 2021», у якім прынялі ўдзел сем'і супрацоўнікаў РУП «Белпошта». Арганізатарамі мерапрыемства выступіла раённая арганізацыя рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» і адміністрацыя Ленінскага раёна г. Мінска.

Свята накіравана на прапаганду сямейных каштоўнасцяў, здаровага ладу жыцця і прафілактыку асацыяльных паводзін грамадзян, развіццо формаў сямейнага вольнага часу і творчасці, падтрымку сацыяльнай і творчай ініцыятывы сям'і, грамадзянска-патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення.

У мерапрыемстве ўзялі ўдзел дзве сям'і супрацоўнікаў РУП «Белпошта». Яны спаборнічалі ў спартыўным, творчым і інтэлектуальным конкурсах.

# УСЁ ДЛЯ НАВЕДВАЛЬНІКАЎ

**Адно з самых утульных, камфортных паштовых аддзяленняў з сучасным электронным абсталяваннем працуе ў Мінскай вобласці ў старажытным Капылі. Мясцовыя жыхары заходзяць сюды з ахвотай. Для наведвальнікаў і супрацоўнікаў тут створаны найлепшыя ўмовы.**

— У рамках мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да XVIII Дня беларускага пісьменства, які сёлета прайшоў у Капылі, наш горад змяніўся. Закранулі змены і гарадское паштовае аддзяленне, — адзначыў **начальнік Капыльскага ўчастка паштовай сувязі Слуцкага РВПС Ігар БУРАК**. — У аддзяленні выкананы сучасны рамонт, тут з'явілася новая ўтульная мэбля, пачала працаваць электронная чарга, дарэчы, з функцыяй папярэдняга запісу. Напрыклад, знаходзячыся дома, чалавек можа выбраць прымальны для яго час і забраніраваць яго для наведвання пошты. Потым у аддзяленні застаецца толькі пацвердзіць гэтую бронь і адразу атрымаць неабходныя паслугі. Гэта, згадзіцеся, для многіх людзей вельмі зручна.

Акрамя таго, у аддзяленні паштовай сувязі абсталяваны прыгожы дзіцячы куток. Каб дзеці, якія прыйшлі з бацькамі на пошту, не сумавалі там у час знаходжання. Маленькія хлопчыкі і дзяўчынкі могуць у гэтым кутку маляваць, займацца на навучальных панэлях, якія знаходзяцца на сценах кутка.

Па словах Ігара Бурака, у гарадскім аддзяленні паштовай сувязі працуе выдатны калектыў. Усе работнікі вопытныя, добрасумленныя, адказныя. Сёння яны вельмі задаволены ўмовамі працы, якія тут створаны. Дарэчы, рамонт выкананы не толькі ў аперацыйнай зале, але і ў



Дзіцячы куток у паштовым аддзяленні.




Будынак Капыльскага ВПС.



Спецыялісты паштовай дзейнасці Алена ЯНЕВІЧ і Валянціна ПАРХІМОВІЧ.

службовых памяшканнях. Прыгожа зараз выглядае і тэрыторыя перад будынкам участка сувязі. А на самым будынку зусім нядаўна з'явіліся дзве тэматычныя карціны, якія, вядома, надаюць прывабнасці.

Сёння ў Капыльскім раёне дзейнічаюць 25 аб'ектаў сувязі, з якіх адно, найбуйнейшае, знаходзіцца ў райцэнтры. Ёсць і перасоўнае аддзяленне, якое абслугоўвае жыхароў вёсак. Самыя буйныя з сельскіх аддзяленняў знаходзяцца ў Цімкавічах і Быстрыцы.

— Усяго ў нашым аддзяленні працуе 11 работнікаў, сярод іх — пяць паштальёнаў, — паведаміла **начальнік АПС Таццяна ЛАЗЮК**. — Абслугоўваем прыкладна 10 тысяч чалавек — усё насельніцтва Капыля. Горад наш невялікі і многіх сваіх кліентаў мы добра ведаем. Зносіны з наведвальнікамі склаліся прыязныя і ўзаемна паважлівыя. Да кожнага знойдзем падыход, вырашым любыя пытанні. Калектыў аддзялення склаўся дастаткова даўно. Дарэчы, усіх супрацоўнікаў адбіралі старанна, улічваючы як дзелавыя, так і чалавечыя якасці. Адносіны паміж людзьмі вельмі дружныя. Некаторыя работнікі маюць вельмі салідны вопыт. Я сама працую ў галіне сувязі 39 гадоў. Але хачу падкрэсліць, што ўсе без выключэння нашы супрацоўнікі захавалі адданасць сваёй прафесіі.

**Сяргей РУЧАНАЎ, фота аўтара.**




Да паслуг наведвальнікаў — сучаснае электроннае абсталяванне.

Меншыя браты

# АД ПРАТЭЗАЎ ДА ЦЭНТРА РЭАБІЛІТАЦЫІ

## Ветэрынар з Ліды ставіць хатніх гадаванцаў на новыя лапы і рыхтуе праект прытулку-гасцініцы для жывёл

**Павел ЖУЛЬПА за апошні год атрымаў вядомасць у краіне сваімі незвычайнымі аперацыямі. Ён першы ў Беларусі правёў пратэзаванне адразу дзвюх лап у ката і зараз рыхтуецца да падобнай аперацыі ў сабакі. Гэта таксама будзе першы такога роду вопыт. Між тым яго планы даволі маштабныя. Ветэрынар марыць адкрыць у Лідзе цэлы комплекс для чатырохногіх спадарожнікаў чалавека з прытулкам для бяздомных жывёл.**

Мы пазнаёміліся з Паўлам падчас нядаўняй прэзентацыі ў Гродне маладзёжных праектаў. Ён прыехаў са сваімі памочнікамі-валанцёрамі. Але самым незвычайным было ўбачыць іх выхаванку — кошку па мянушцы Лапа. Яна хадзіла на дзвюх сваіх і на дзвюх «новых» лапках. Некалькі месяцаў таму ёй паставілі пратэзы, да якіх яна паступова прывыкае. Валанцёры расказалі, што траўміраваную Лапу падабралі на вуліцы. Адразу два пратэзы ў кошкі — такое ў Беларусі зрабілі ўпершыню. Усяго лідскі доктар правёў некалькі падобных аперацый.

— Гэтыя жывёлы бяздомныя, хоць першы коцік па мянушцы Філя быў гаспадарскі. Ён пайшоў гуляць і атрымаў тэрмічны апёк, яму прыйшлося ампутаваць лапку. Мы прапанавалі гаспадару ката зрабіць пратэз, ён пагадзіўся. Паспрабавалі — і ўсё атрымалася, — успамінае Павел Жульпа.

Год таму пратэз замяніў заднюю лапку бяздомнай аўчарцы. Сабаку таксама падабралі, выхадзілі, далі мянушку Хоўп (з англ. — «надзея»). Потым пачалі рыхтаваць да аперацыі. Павел дэманструе мне відэакадры, дзе Хоўп ужо з дапамогай пратэза носіцца па двары і нават ганяе мясцовага ката.

Усе гэтыя цуды магчымыя дзякуючы сучасным тэхналогіям. Біянічныя пратэзы вырабляюцца пры дапамозе 3D-прынтара з тытанавага сплаву. Важаць яны некалькі грамаў. Кожны робіцца па канкрэтным замеры косці, куды потым ужыўляецца і становіцца яе працягам. Паступова біянічны пратэз зрастаецца з целам жывёлы.

**— Раней гэта праблематыка не была зразумелай у грамадстве, — кажа доктар. — Няма ў жывёлы лапы і няма. Цяпер іншы падыход. Няма лапы — давайце яе зробім.**

Мяне зацікавіла, як рэагуюць жывёлы на іншародны цела? Ці не імкнуцца пазбавіцца ад яго, напрыклад адкусіць зубамі?

— Нармальна рэагуюць, бо ёсць кропка апоры, яна не баліць, жывёла можа бегаць. Бяздомная аўчарка з заднім пратэзам, якая зараз жыве ў мяне, наўрад ці адчувае псіхалагічныя праблемы ад таго, што гэта лапка не пакрытая шэрсцю, для яе гэта паўнавартасная апора. Тут фішка ў тым, што пратэз урастае ў косць і становіцца з ёй адным цэлым, — патлумачыў Павел.

Пакуль жывёлы апіраюцца на сіліконавыя наканечнікі, але ў хуткім часе яны атрымаюць пушыстыя лапкі, якія будуць выглядаць як сапраўдныя. Тэхналогію друку пратэзаў асвоілі ў Новасібірску, кожны канкрэтны выраб робіцца па індывідуальным заказе. І гэта нятанна. Па словах майго суразмоўніка, цана пратэза, які заказваецца ў Расійскай





Федэрацыі, каля 500 долараў. Не кожны гаспадар гатовы заплаціць за свайго траўміраванага выхаванца такую суму. Хутчэй зганджаецца на крайнюю меру — усыпіць жывёлу.

— Таму мы пачалі шукаць іншыя магчымасці. У нас, у Беларусі, ёсць 3D-прынтар, які можа друкаваць такія пратэзы, і яны ў разы таннейшыя за расійскія аналагі. Гэта значны крок да развіцця новай паслугі, якая будзе даступная. Да таго ж гарантуе яшчэ і хуткасць, бо з Расіі даводзіцца чакаць некалькі месяцаў, а то і паўгода, а для атрымання беларускіх пратэзаў спатрэбіцца 2-3 тыдні, — дадае Павел.

Павел Жульпа мае 20 гадоў практычнага стажу. Працаваў напачатку ў сельгасгаспадарцы, пазней — у прыватнай клініцы, а праз некаторы час адкрыў уласны цэнтр з вясёлай назвай «Кот Бегемот». Паралельна працуе з дзецьмі ў праекце «Заалагічны доктар» сумесна з раённым цэнтрам экалогіі і краязнаўства. Праект мае некалькі ступеняў знаёмства з прафесіяй ветэрынара. Тэарэтычны курс школьнікі праходзяць у самім цэнтры, а вось практыка адбываецца ў ветэрынарнай клініцы. Старшакласнікі назіраюць за лячэннем жывёл і працуюць як валанцёры. Гэта, на думку Паўла Жульпы, дазваляе вызначыцца з выбарам прафесіі ветэрынарнага доктара альбо ўвогуле зацікавіцца медыцынай.

— Мы праз інавацыі стараемся паказаць новыя магчымасці, каб дзецям было цікава займацца. Акрамя таго, падлеткі бачаць работу, якая сапраўдная ветэрынара. Тыя, хто застаецца і не сыходзіць з праекта, стануць добрымі спецыялістамі, — не сумняваецца суразмоўнік. — Многія па-іншаму сталі глядзець на жывёл.

Лідскія старшакласніцы Злата Субоціна і Дар'я Рулько даведаліся аб ветэрынарным цэнтры «Кот Бегемот» з сацыяльных сетак і вырашылі паспрабаваць сябе ў гэтай справе. Усё лета хадзілі на практычныя заняткі, аказвалі дапамогу траўміраваным катам, сабакам, буслам, нават галубам і трусам. Большасць жывёл, кажуць дзяўчаты, альбо выпадалі з вокнаў, альбо аказваліся збітымі машынамі.

Напрыклад, дваровы сабака Джэк трапіў пад цягнік, і яму адрэзала дзве пярэднія лапы, зараз ён не можа хадзіць, знаходзіцца ў валанцёраў і, што называецца, у «лісце чакання» на аперацыю. Яму зрабілі ўсе неабходныя замеры і заказалі пратэзы. Пакуль у Беларусі не пратэзавалі адразу дзве лапы сабаку. Такая аперацыя стане яшчэ адным прарывам у ветэрынарнай хірургіі, заўважае Павел.

На сёння «Кот Бегемот» — адзіны ў краіне ветэрынарны цэнтр, дзе створана і падтрымліваецца такая ініцыятыва, як пратэзаванне. Доктар не тоіць свае інавацыі, наадварот, шырока прапагандуе новыя магчымасці для жывёл. Зараз у яго планах — правесці майстар-клас на факультэце ветэрынарнай медыцыны Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта. Ён правядзе аперацыю кату Персіку, у якога траўміравана задняя лапка. На ёй няма падушачак, таму ступіць на гэтую лапу кот не можа. Каб дапамагчы Персіку, яму ў галёнку будзе ўжыўлены пратэз. Жывёлы-інваліды маюць права на дапамогу. Зараз, напрыклад, рыхтуецца пратэз для... вароны. Лапу скanіравалі і надрукавалі ў Гродзенскім тэхнапарку, каб паказаць, што і такое магчыма. Варона жыве ў сваіх гаспадароў і ў хуткім часе будзе з новай лапай.

**Біянічныя пратэзы вырабляюцца пры дапамозе 3D-прынтара з тытанавага сплаву. Важаць яны некалькі грамаў. Кожны робіцца па канкрэтным замеры косці, куды потым ужыўляецца і становіцца яе працягам.**

— Раней гэта праблематыка не была зразумелай у грамадстве, — кажа доктар. — Няма ў жывёлы лапы і няма. Цяпер іншы падыход. Няма лапы — давайце яе зробім. Таму што гэта выратоўвае жыццё, папярэджвае захворванні, якія развіваюцца пры адсутнасці лап, у тым ліку апорна-рухальнай сістэмы. Немалаважны і сацыяльны аспект. Усё ж такі жывёла на пратэзах выклікае меншы псіхалагічны дыскамфорт, чым жывёла без лапак. Прыйшоў час разумець, што пратэз — адзін з метадаў лячэння. Неабавязкова ўсыпляць, калі няма адной ці дзвюх лапак. Як паказаў першы вопыт, амаль кожную жывёлу, якая атрымала траўму, можна выратаваць.

Лідскі Айбаліт марыць аб шырокамаштабнай дапамозе хворым жывёлам. І такая перспектыва ёсць. Ён планує стварыць вялікі рэабілітацыйны цэнтр для жывёл рэспубліканскага маштабу, дзе будзе аказвацца і медыцынская, і сацыяльная дапамога. Праект скіраваны яшчэ і на тое, каб палепшыць умовы ўтрымання бяздомных жывёл і знайсці ім новых гаспадароў.

Мяркуецца, што гэта будзе цэлы комплекс будынкаў з гасцініцай, медыцынскім цэнтрам, рэабілітацыяй, нават басейнам для жывёл. Такі глабальны праект, лічыць Павел, дазволіць убачыць праблему суіснавання чалавека і жывёльнага свету пад іншым ракурсам — праз канкрэтную справу, якая намнога важнейшая, чым звычайнае спачуванне.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

І так бывае...

# СЫГРАЎ НА ПАЧУЦЦЯХ

## Барысаўчанка аддала «на лячэнне» больш за 1000 долараў

**Супрацоўнікі міліцыі затрымалі грамадзяніна Казахстана, які знаёміўся з адзінокімі жанчынамі, а затым падманным шляхам завалодваў іх грашыма. Ад дзеянняў гэтага мужчыны пацярпела не толькі жыхарка Барысава, але і некалькі мінчанак.**

Больш за год таму 62-гадовая барысаўчанка праз сайт пазнаёмілася з мужчынам, які прадставіўся Сяргеем. Завязалася актыўная перапіска, і той досыць хутка ўвайшоў у давер да жанчыны, паведамляе падраздзяленне групы інфармацыі і грамадскіх сувязяў Барысаўскага РУУС.

Праз нейкі час новы знаёмы паведаміў страшную навіну: нібыта ён трапіў у ДТЗ і моцна пацярпеў. На адналенне неабходна буйная сума грошай — не менш за 5000 долараў. Браць грошы бязвыплатна мужчына не меў намер, прасіў толькі ў доўг.

Жанчына была не супраць дапамагчы віртуальнаму сябру, аднак такой сумы ў яе не было, але яна гатова была пазычыць усе наяўныя ў яе збераженні — 1100 долараў і 270 рублёў.

Сяргей адразу пазначыў, што прыехаць па грошы сам не ў стане, таму іх трэба ў самыя кароткія тэрміны аддаць яго сябру Кайрату, а той ужо перадасць.

І сапраўды, з барысаўчанкай адразу ж звязаўся мужчына з такім імем. Ён расказаў, што з'яўляецца добрым прыяцелем Сяргея, і запэўніў, што грошы трапяць да адрасата. На тым і дамовіліся: у абумоўлены дзень на адной з вуліц горада жанчына перадала ўсю суму і стала чакаць выздараўлення знаёмага і вяртання пазычаных грошай.

Жанчына западозрыла нядобрае, калі стасункі з віртуальным знаёмым практычна спыніліся. А пасля звароту ў праваахоўныя органы карціна праяснілася: Сяргей і Кайрат аказаліся адным і тым жа чалавекам, які па надуманых падставах, гісторыяй з ДТЗ, шляхам падману і злоўжывання даверам завалодаў грашовымі сродкамі пацярпелай.

# «УСТАНАВІЎ» СУВЯЗЬ

**У міліцыю звярнулася супрацоўніца аднаго з віцебскіх салонаў сувязі. Яна паведаміла, што каля васьмі гадзін вечара невядомы малады чалавек, разглядаючы асартымент мабільных тэлефонаў, адкрыта выкраў смартфон «Apple iPhone 12 Pro Max» коштам 6875 рублёў.**

Падчас агляду месца злачынства спецыялістам Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Віцебскай вобласці на паверхнях мабільных тэлефонаў, да якіх дакрануўся зламыснік, былі выяўленыя сляды рук. Высветлілася, што яны належаць 20-гадоваму жыхару Лепеля, паведамляе УУС Віцебскага аблвыканкама. Інфармацыя неадкладна была перададзена міліцыянерам.

Падазраваны ў рабаванні быў затрыманы інспектарамі ДАІ праз дзень пасля здзяйснення злачынства. Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Першамайскага РАУС высветлілі, што за гэты час малады чалавек паспеў прадаць тэлефон па цане, у некалькі разоў ніжэйшай за рынкавую. За гэтыя грошы ён набыў аўтамабіль, на якім і быў спынены праваахоўнікамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

24 верасня 2021 г. № 37 (622)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


АДКРЫТЫ ФОРУМ







# ПА ГРАФІКУ І Ў РЭЗЕРВОВЫ ДЗЕНЬ

## Як арганізавана ўборка бульбы на сотках вяскоўцаў

**У разгары — уборка бульбы. У вёсцы амаль кожная сям'я па-ранейшаму садзіць бульбу, за выключэннем хіба сезонных жыхароў-дачнікаў. Калі не ў полі, то ў агародзе дакладна ёсць сотка ці дзве. А ў верасні паўстае пытанне яе ўборкі. Звычайна капаць бульбу з'язджаюцца гарадскія сваякі, і тады нярэдка ўзнікае праблема тэхнікі. Трэба ж тую бульбу выкапаць, потым завезці на падворак. Як гэтую праблему вырашаюць у розных рэгіёнах Брэстчыны, у розных населеных пунктах — сённяшняя гаворка карэспандэнта «МС» са старшынямі сельскіх Саветаў.**

стар. 18

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

**Наталля КАЧАНАВА:**

# «ЛЮДЗЕЙ ТРЭБА ЧУЦЬ І СТАВІЦЦА ДА ІХ ПА-ДОБРАМУ»

## Работу са зваротамі грамадзян разгледзелі на пасяджэнні выязнога пашыранага Прэзідыума Савета Рэспублікі, якое прайшло ў Бярозе

**Напярэдадні сенатары правялі адзіны дзень прыёму грамадзян у Брэсцкай вобласці. А ў Бярозе сабраліся, каб падвесці вынікі прыёму і ў цэлым прааналізаваць работу органаў улады на месцах са зваротамі грамадзян. У рабоце прынялі ўдзел старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА, кіраўнікі раённых Саветаў і зацікаўленых ведамстваў.**

стар. 8

СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

# Важны давер

**На гэтым тыдні «сенатарскі дэсант» высадзіўся на Брэстчыне: менавіта тут у сераду, 22 верасня, правялі адзіны дзень прыёму члены Прэзідыума Савета Рэспублікі і сенатары, абраныя ад гэтага рэгіёна. Спікер верхняй палаты парламента Наталля КАЧАНАВА пагутарыла з людзьмі ў Ляхавічах: асабіста да яе са сваімі праблемамі за восем гадзін паспелі звярнуцца 50 чалавек (было б і больш, але магчымасці любога прыёму абмежаваныя), якія прыехалі з розных куткоў краіны.**

**Віцэ-спікер Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА** адзіны дзень прыёму грамадзян сенатарамі правёў у Івацэвічах.

Тут да яго звярнуліся са сваімі праблемамі і турботамі каля дзвюх дзясяткаў чалавек.

Каго на асабісты прыём прывяла жыллёвая праблема, каго — жаданне ўнесці прапанову ў заканадаўчыя акты. Сярод актуальных тэм для заяўнікаў — аднаўленне дзейнасці лазні, работа сельмагаў, цэны на хлеб і лекі, арганізацыя прыёму дзікаросаў ад людзей, газіфікацыя, асвятленне вёсак па вечарах, зямельныя спрэчкі, працаўладкаванне...

Так, жыхар вёскі Хойнікі Бярозаўскага раёна прыехаў у Івацэвічы з прапановамі па ўдасканаленні пенсіённага заканадаўства, ён таксама цікавіўся, калі будзе гатовы праект новай Канстытуцыі.

Жыхар вёскі Рудня Івацэвіцкага раёна прасіў пасадзейнічаць у вылучэнні крэдыту для яго дачкі. Пенсіянерка з Івацэвічаў прынесла хадайніцтва аб прызнанні яе вязнем канцлагера з выдачай адпаведнага пасведчання.

Інвалід І групы Ірына Падлipская з аграгарадка Быцень прасіла дапамагчы з атрыманнем сацыяльнага жылля. Зараз жанчына жыве з 92-гадовай маці ў доме з пячным ацяпленнем, па доме дапамагае сацыяльны работнік, але дзвюм жанчынам (адна старая, а другая нямоглая) усё роўна цяжка. Заяўніца расказала, што на чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў стаіць з 2011 года, цяпер зарэгістравана ў інтэрнаце, але там не жыве, бо безбар'ернага асяроддзя там не створана, а інваліду-калясачніку гэта жыццёва неабходна.

Як патлумачыў старшыня Івацэвіцкага райвыканкама Аляксандр Грыцук, які прысутнічаў на прыёме, сітуацыя для ўлады вядомая:

— На жаль, чарга на жыллё сацыяльнага карыстання вялікая. Прапануем Ірыне Уладзіміраўне пераехаць у пакой на першым паверсе інтэрната, абсталюем пляцоўку для захоўвання каляскі. Ёсць таксама месцы ў доме-інтэрнаце, дзе створаны ўмовы для пражывання інвалідаў.

Разгледзеўшы звароты і пагутарыўшы з усімі заяўнікамі, Анатоль Ісачанка даў шэраг даручэнняў мясцовай вертыкалі ўлады. А падсумоўваючы вынікі прыёму, у гутарцы з журналістамі ён адзначыў, што рашэнне канкрэтных жыццёвых праблем грамадзян — ключавое ў дзейнасці сенатараў.

— Кожны прыём або прамая тэлефонная лінія — гэта магчымасць выявіць сістэмныя праблемы і аказаць дапамогу тым нашым суайчыннікам, каму яна сапраўды неабходная, — падкрэсліў ён.

Акрамя таго, віцэ-спікер Савета Рэспублікі звярнуў увагу на асаблівасць прыёму ў Івацэвічах: сярод заяўнікаў было шмат тых, хто раней ужо звяртаўся ў розныя дзяржаўныя органы, аднак не змог там вырашыць свае праблемы.

— Кожны зварот, які паступіў, мы бяром на кантроль і накіроўваем адпаведныя даручэнні ў профільныя інстанцыі. Важна, што грамадзяне ўсё больш давяраюць Савету Рэспублікі ў вырашэнні сваіх жыццёвых праблем, — падсумаваў Анатоль Ісачанка.

# «ЛЮДЗЕЙ ТРЭБА ЧУЦЬ І СТАВІЦЦА ДА ІХ ПА-ДОБРАМУ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Пасяджэнне адкрыла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.**

— Грамадзянамі падчас прыёмаў у рэгіёне былі пастаўлены ў большасці сваёй абсалютна жыццёвыя пытанні. Вядома, першая ўмова рашэння любой праблемы — дзейнічаць у рамках закона. А калі нешта заканадаўча не ўрэгулявана, трэба ісці насустрач людзям, шукаць выйсце разам.

Яна заўважыла, што на прыём некаторыя заяўнікі прыходзілі з таблеткамі, бо хваляваліся.

— Для асобнага чалавека не так проста прыйсці да прадстаўніка ўлады з асабістай праблемай. Я зараз пра тое, што да людзей трэба ставіцца па-добраму. У гэтым упэўніваюся кожны прыём: нават калі ты не можаш дапамагчы — выслухай, падкажы чалавеку, куды можна пайсці, дзе атрымаць кансультацыю. У гэтай рабоце нельга спяшацца, — пераканана Наталля Качанава.

Спікер верхняй палаты парламента нагадала прысутным, што ў Савеце Рэспублікі дзейнічае экспертны савет. Зараз ідзе абмеркаванне паправак у заканадаўства па пытаннях пенсіённага забеспячэння, сямейнага капіталу, забеспячэння жыллём шматдзетных сем'яў, іншых. «Магчымыя папраўкі мы абмяркоўваем у экспертным савеце, на які запрашаем людзей з месцаў, — працягвала Старшыня Савета Рэспублікі. — Скажам, па-ранейшаму ёсць праблемы з пустымі дамамі ў вёсках. Ніхто не можа падказаць лепш па гэтай тэме, як старшыня сельскага Савета альбо прадстаўнік райсавета. Жыццё не стаіць на месцы, праблемы ўзнікаюць з-за недакладнасці законаў, і гэтыя хібы мы можам устараніць у ходзе далейшай работы. Трэба ўносіць прапановы».

Варта сказаць, такія прапановы гучалі ў ходзе работы пасяджэння.

— Сёлета ў Савет Рэспублікі паступіла 443 звароты з Брэстчыны, — расказала **загадчык аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і ўнутраным кантролі Савета Рэспублікі Вольга НЯДВЕЦКАЯ**. — З іх 183 былі адрасаваны членам Прэзідыума Савета Рэспублікі. Тэматыка іх асабліва не адрозніваецца ад другіх абласцей. Нават адзіны дзень прыёму яшчэ раз паказаў,



што, напрыклад, для жыхароў Пінскага раёна актуальнай застаецца якасць пітной вады, для Іванаўскага — прыбіранне дваровых тэрыторый. Сенатары адзначаюць, што гэтыя пытанні агучваліся грамадзянамі і раней, і яны паступова вырашаюцца.

Напрыклад, з вёскі Рудня Івацэвіцкага раёна людзі скардзіліся на праблемы працаўладкавання. Па даручэнні Савета Рэспублікі адбылася сустрэча кіраўнікоў раённай выканаўчай улады з жыхарамі вёскі. Людзі атрымалі прапановы па працаўладкаванні з дастаўкай да месца работы альбо пералік вакансій з пераездам на новае месца жыхарства. Да сенатара Васіля Маркевіча звярнулася жыхарка пасёлка Жамчужны Баранавіцкага раёна з просьбай усталявання стацыянарнай электрасувязі для падключэння сеткі інтэрнэту. Пытанне ўрэгулявана. І да пачатку наступнага года заяўніца атрымае інтэрнэт. З Ляхавіцкага раёна паступіла скарга на немагчымасць нарыхтаваць сена для ўласнай каровы. Гаспадару не выдзялялі ўчастак. Па выніках звароту сельгаспрадпрыемства забяспечыла заяўніка сенам, а на наступны год правялі перазалужэнне поля з тым, каб вясной выдзеліць участак для сенакосу. Такіх прыкладаў можна прыводзіць мноства.

Адзначалася, што адзіны дзень прыёму сенатарамі спрыяе паляпшэнню ў тым ліку маральнай абстаноўкі ў рэгіёнах. Адметным стаў дзень 22 верасня на Брэстчыне, калі грамадзяне маглі звярнуцца як да сенатараў, так і да старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў. У гэты дзень на прыёмы прыйшло каля 200 чалавек. 147 з іх звярнуліся да членаў Савета Рэспублікі. Пытанні былі самыя розныя: ЖКГ, добраўпарадкаванне, транспарт, ахова здароўя, пенсіённае забеспячэнне. Што важна, з вуснаў грамадзян прагучалі прапановы па змяненні заканадаўства.

Пра работу са зваротамі ў абласным выканаўчым камітэце і ў раёнах расказаў **намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь БАРЫСЮК**.

Паводле яго слоў, з пачатку года 1705 чалавек звярнулася ў абласны выканаўчы камітэт, 11 працэнтаў зваротаў было вырашана станоўча, астатнія заяўнікі атрымалі вычарпальныя тлумачэнні. На прамыя тэлефонныя лініі сталі звяртацца больш, паступаюць звароты і праз сацыяльныя сеткі. Генадзь Барысюк, дарэчы, прапанаваў суботнія тэлефонныя прамыя лініі праводзіць у сельвыканкамах. «За восем месяцаў паступіла ўсяго 67 зваротаў на прамыя лініі сельвыканкамаў у рабочыя дні». Дакладчык паведаміў, што колькасць зваротаў грамадзян у аблвыканкам павялічылася, а пісем ад юрыдычных асоб паменшылася. Менш сталі звяртацца з Брэстчыны ў Адміністрацыю Прэзідэнта і Дзяржкантроль. «Як паказвае практыка, значная колькасць зваротаў патрабуе толькі тлумачэння юрыдычных аспектаў. Аналіз паўторных зваротаў паказвае, што многія з іх не абгрунтаваны», — кажа намеснік старшыні аблвыканкама.

Яшчэ на адной праблеме акцэнтаваў увагу Генадзь Барысюк. Звароты нярэдка спараджае недакладнасць заканадаўства. У адной з вёсак Драгічынскага раёна шматдзетная сям'я атрымала субсідыю на будаўніцтва дома. Так сталася, што спачатку памёр галава сям'і, а потым, не ўступіўшы ў правы спадчыны, і яго жонка. Банк прыпыніў фінансаванне, бо ў законе такі нюанс не прадугледжаны.Тады аблвыканкам звярнуўся да кіраўніка дзяржавы. І сваёй рэзалюцыяй Прэзідэнт вырашыў пытанне на карысць шматдзетнай сям'і.

Віцэ-губернатар расказаў аб формах кантролю работы са зваротамі грамадзян. Практыкуюцца справаздачы пра работу са зваротамі старшынь райгарвыканкамаў, дырэктараў прадпрыемстваў. Наладжана ўзаемадзеянне з пракуратурай, іншымі зацікаўленымі структурамі. Праводзяцца сумесныя з пракуратурай праверкі гэтай работы. Такая была нядаўна ў Столінскім раёне.

Аказваецца, бываюць сітуацыі, калі спецыялістам на месцах не заўсёды хапае кампетэнцыі. Напрыклад, заяўніцы не маглі зарэгістраваць садовы домік у Ляхавіцкім раёне. Патрэбна была даведка ад старшыні садовага таварыства, а старшыні не мелася, бо ён не быў абраны. Варта было



паспрыяць абранню, каб давесці пытанне да канца. Давялося ўмяшацца аблвыканкаму.

Ёсць у вобласці жыхары, якія пішуць звароты альбо ходзяць на прыёмы да 80 разоў у год. З 15 сёлета была спынена перапіска, летась такіх было 22. Розныя прапановы прагучалі наконт вырашэння названай праблемы.

Наталля Качанава заўважае па ходзе абмеркавання, што агучанае дакладчыкам становішча, калі расце колькасць зваротаў у аблвыканкам і памяншаецца ў рэспубліканскія органы, сведчыць аб добрай рабоце кадраў. Так і павінна быць.

**Старшыня Бярозаўскага райвыканкама Сяргей БАРТАШ** падзяліўся вопытам інфармавання насельніцтва: «Мы практыкуем прамыя лініі, вялікую ўвагу ўдзяляем інфармаванню людзей праз СМІ, найперш раённую газету. Нашы грамадзяне ведаюць, калі і дзе будзе праводзіцца рамонт, добраўпарадкаванне, мадэрнізацыя сацыяльных аб'ектаў.

Папярэдзіла многія звароты ўстаноўка апарата КТ у бальніцы, гэта важны аб'ект у плане аховы здароўя».

У Пружанскім раёне практыкуюцца дні сельскіх Саветаў, калі ў вёску выязджае група спецыялістаў, вывучае сітуацыю. У вызначаны дзень прыём вядзе старшыня райсавета альбо выканкама. Потым на агульным сходзе падводзяцца вынікі, абмяркоўваюцца праблемы. 39 даручэнняў па выніках таго дня Савета атрымалі нядаўна розныя аддзелы, упраўленні, установы і арганізацыі, паведаміў **старшыня райсавета Мікалай КУДРАВЕЦ**.

У размове з журналістамі пасля пасяджэння Наталля Качанава яшчэ раз адзначыла важнасць і важкасць работы са зваротамі грамадзян: «Як падкрэслівае Прэзідэнт нашай краіны, з людзьмі трэба працаваць, іх трэба чуць, а яшчэ лепей — працаваць на апярэджванне».

Завяршылася мерапрыемства ўскладаннем кветак да памятнага знака вязням канцлагера «Бяроза-Картузская» і наведваннем экспазіцыі, прысвечанай гісторыі гэтага лагера.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Фота БелТА.**

МЕРКАВАННЕ

**Таццяна РУНЕЦ:**

## «Пераарыентацыя экспарту ў краіны Азіі і Лацінскай Амерыкі дазволіць мінімізаваць меры эканамічнага ўдушэння Беларусі санкцыйнай палітыкай Захаду»

### Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:

— Трэба разумець, што нядаўнія прызначэнні дыпламатаў у Таджыкістан, Бразілію і Рэспубліку Карэя носяць не толькі знешнепалітычны характар, але і, безумоўна, маюць і эканамічны кантэкст, паколькі арыентаваныя на ўмацаванне гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і краінамі, куды накіроўваюцца нашы надзвычайныя і паўнамоцныя паслы. Ва ўмовах санкцыйнага ціску калектыўнага захаду на нашу краіну гэты парадак дня становіцца як ніколі актуальным: упэўненая, што пераарыентацыя часткі беларускага экспарту ў краіны Азіі і Лацінскую Амерыку дазволіць мінімізаваць наступствы навязвання палітыкі так званай дэмакратызацыі праз меры эканамічнага ўдушэння краін, нязгодных з такой палітыкай.

Што датычыцца і Таджыкістана, і Бразіліі — ёмістасць рынкаў і патэнцыял гэтых краін маюць усе падставы для росту паказчыкаў узаемнага тавараабароту. Так, Бразілія з'яўляецца лакаматывам супрацоўніцтва з нашай краінай у Лацінскай Амерыцы (па тавараабароце яна ўваходзіць у дваццатку найбуйнейшых партнёраў нашай дзяржавы). Акрамя таго, далёка не раскрыты і патэнцыял азіяцкага напрамку, дзе рынкі Рэспублікі Карэя і Таджыкістана ўяўляюць цікавасць для сусветных і айчынных вытворцаў.

Дарэчы, новы Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Таджыкістане будзе па сумяшчальніцтве працаваць і дыпламатам у Афганістане: летась паказчык па тавараабароце з гэтай краінай склаў больш за 181 мільён долараў. Мы разлічваем на захаванне дасягнутых вынікаў, а ў перспектыве — пашырэнне гандлёва-эканамічнай прысутнасці.

Хачу адзначыць, што дзейнасць дыпламатаў па прасоўванні беларускай прадукцыі ў напрамку далёкай дугі дасць магчымасць не толькі ўмацаваць пазіцыі Рэспублікі Беларусь на сусветным рынку, але і прадэманструе магчымасці нашай краіны па пераадоленні аднабаковых супрацьзаконных санкцый Захаду.

Хачу на TV!

# Як трапіць у кадр?

**Чарговы падарунак для прыхільнікаў рыхтуе тэлепраект «ПІН_КОД». З 1 кастрычніка ў рамках праграмы стартуе рэаліці «Хачу ў ПІН_КОД!», і гэта якраз магчымасць для ўсіх, хто жадае стаць вядучым.**

— Сёлета мы з удзельнікаў сфарміруем каманды, якія будуць курыраваць вядучыя нашага праекта. То-бок, не толькі на майстар-класах усё пабудавана, але і на ўзаемадзеянні ўнутры каманды. Усе выпрабаванні — на крэатыўнасць, адукаванасць і ўменне працаваць у калектыве, — распавядае **аўтар праекта «ПІН_КОД» Ягор ШОЛЬКІН**. — Нам перш за ўсё важна зразумець, ці зможа чалавек быць вядучым альбо карэспандэнтам праграмы. Прапануем звычайныя заданні, але і на аснове іх праяўляюцца ўсе якасці ўдзельнікаў. Асабліва важна, каб іх прынялі ў нашым калектыве, таму што ўсім жа хочацца працаваць у камфортнай атмасферы. Вядома, нічога не атрымаецца і без жадання прыкладаць намаганні для здзяйснення сваёй мары. Наш праект — добрая пляцоўка, каб паказаць сябе і, магчыма, нават апрабаваць нейкія свае ідэі, праекты няхай спачатку і ў міні-фармаце. Гэта дапаможа зразумець, наколькі вы цікавыя аўдыторыі.

Зараз ужо на адрас «ПІН_КОДа» прыйшло больш за 30 заявак і з кандыдатамі вядучца папярэднія перамовы. А мы нагадаем, што падаць заяўку на ўдзел у кастынгу могуць школьнікі і студэнты ва ўзросце ад 15 да 23 гадоў. Сярод галоўных патрабаванняў да будучых прэтэндэнтаў нязменна — бездакорная мова, шырокі кругагляд і адказнасць. Па выніках кастынгу творчая група тэлепраекта выбера 12 удзельнікаў, якія потым пройдуць навучанне ў вопытных тэлевядучых, карэспандэнтаў і рэдактараў. І гэта дазволіць удзельнікам майстар-класаў даведацца ўсе тонкасці работы ў прамым эфіры, навучыцца ствараць сюжэты і ўдасканаліць тэхніку маўлення. Аднак да фіналу дойдуць толькі двое. А да гэтага кожны тыдзень прэтэндэнты на ролю вядучых будуць выконваць творчыя заданні, што маюць непасрэднае дачыненне да тэлевізійнай вытворчасці. Ацэньваць іх будзе прадзюсарская група тэлеканала «Беларусь 2». Тыя, хто здабудзе ў выніку найменшую колькасць балаў, страцяць шанц працягваць барацьбу і пакінуць праект. Але насуперак любым прагнозам усё ж варта паспытаць удачу!

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 129

Шахматны бюлетэнь «Альбіна» запрашае беларускіх кампазітараў да ўдзелу ў міжнародным тэматычным конкурсе складання двуххадовых задач. Тэма: «Чаргаванне тыпаў фігур аднаго колеру, якія ходзяць на два і больш палёў у розных фазах. Дазваляецца цыклічны від чаргавання».

Суддзя конкурсу — Міхаіл Храмцэвіч (Беларусь). Задачы можна дасылаць да 1 снежня 2021 года на яго адрас: xramcevich66@mail.ru. Устаноўлены прызы.

Прыклады (ва ўсіх — мат за 2 хады):

№ 1. Аляксандр Есьман, Валерый Разінкін (1980).

**Белыя:** Kph3, Фс7, Лb7, Лf5, Cb8, Cd5, Kd4, пd2 (8).

**Чорныя:** Kpg1, Ла2, Cb4, Kc6, Kd7, пп. a5, d3, e5, h4 (9).

1. Фb6? ~ 2. Ke2x, 1...Cc5 2. Фb1x, 1...ed 2. Ch2x, 1...K:d4 2. Фg6x, 1...K:b6/Kc5 2. Лg7x, але 1...e4! Рашае 1. Ca7! ~ 2. Ke2x, 1...Cc5 2. Лb1x, 1...e4/ed 2. Фh2x, 1...K:d4/K:a7 2. Фс1x, 1...Kb6/Kc5 2. Фg7x Тэма выканана на фоне перамены чатырох матаў.

№ 2. Міхаіл Кошаль (2021).

**Белыя:** Kph5, Фа3, Лс5, Лd3, Cf3, Kd7, Ke2 (7).

**Чорныя:** Kpf5, Лd5, Ce1, Kh6, пп. e5, e6, g4 (7).

1. Фа4? ~ 2. Фе4x/Ce4x, 1...gf 2. Л:f3x, 1...Лd4 2. Л:e5x, 1...Л:d7 2. Фf4x, але 1...Cb4! Рашае 1. Лd4! ~ 2. Ce4x, 1...gf 2. Ф:f3x, 1...Л:d4 2. Л:e5x, 1...Л:d7 2. Лf4x, 1...ed 2. Фd3x Тэма выканана на фоне перамены двух матаў.

№ 3. Жан Морыц (1960).

**Белыя:** Kpg1, Фg2, Лf8, Лg4, Cb8, Ch7, Ka6, пп. c6, e5, h3 (9).

**Чорныя:** Kpe6, Лd5, Лh5, Ca2, Cf6, Kf1, Kf7, пе7 (8).

1. Ле4? ~ 2. Kc7x, 1...Лd:e5 2. Ф:a2x, 1...Лh:e5/Л:h7 2. Фg4x, 1...C:e5 2. Фg6x, 1...K:e5 2. Фg8x, але 1...Лd7! Рашае 1. Фе4! ~ 2. Kc7x, 1...Лd7/Лd:e5 2. Kc5x, 1...Лh:e5 2. Cf5x, 1...C:e5 2. Лg6x. 1...K:e5 2. Cg8x Тэма выканана з пераменай функцый хадоў «уступ — матуючы ход».

№ 4. Караль Млынка (1992) *(гл. дыяграму).*



**Белыя:** Kpc3, Фf6, Ла2, Ла3, Ce5, Cf5, Kg4, пп. c6, d3, d7, e6 (11).

**Чорныя:** Kpf3, Лh5, Cg8, Kf8, Kh1, пп. a5, c4, g5, g6, h7 (10).

Прапануем чытачам гэтую задачу для самастойнага рашэння. Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Як і абяцалі, працягваем расповед пра сёлетнюю сусветную анлайн-алімпіяду. Беларуская зборная, заняўшы другое месца ў адной з груп другога дывізіёна, працягнула барацьбу ў групе «С» топ-дывізіёна. На жаль, у кампаніі больш моцных, чым раней, канкурэнтаў наша каманда заняла восьмае месца з дзесяці. Яна перамагла зборныя Малдовы, Егіпта і кітайскага Шэньчжэня, згуляла ўнічыю з Венгрыяй, а саступіла Індыі, Азербайджану, Францыі, Славеніі і Швецыі.

З улікам гульні ў абодвух дывізіёнах сярод мужчын Аляксей Аляксандраў набраў 5 балаў з 10, Кірыл Ступак — 6 з 7, запасны Аляксей Фёдараў — 6 з 11, запасны Міхаіл Нікіценка — 6 з 8. На жаночых дошках у Аляксандры Тарасенкі — 8,5 з 16, у Яны Ільючык — 11 з 13, у запаснай Ксеніі Норман — 3 з 7. Сярод юніёраў у Дзяніса Лазавіна — 7,5 з 10, у Ксеніі Зелянцовай — 6 з 10, у запасных Вячаслава Зарубіцкага і Варвары Паляковай — адпаведна 4 з 8 і 6,5 з 8.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. Фf8. Першыя правільна адказалі Фёдар Карпей, Ігар Ананіч, Васіль Жуковіч, Васіль Барысевіч, Сяргей Цыльнік, Віктар Жук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

## ЗА КРОК ДА ВЯЛІКАЙ СЦЭНЫ

**Да старту «Х-фактар у Беларусі» застаюцца лічаныя тыдні, але ўжо 25 верасня на тэлеканале «Беларусь 1» распачнецца паказ тэледзённікаў праекта. Аб шоу распавядаюць таксама ў інфармацыйных выпусках Агенцтва тэлевізійных навін, у ранішняй праграме «Добрай раніцы, Беларусь!» і ў эфіры каналаў Беларускага радыё.**

Падрыхтоўка найбуйнейшай эфірнай падзеі тэлесезона — на фінішнай прамой, і ўжо зусім хутка Белтэлерадыёкампанія прадставіць першы сезон папулярнай франшызы. Канкурсанты, сярод якіх каля 300 яркіх і таленавітых людзей з розных куткоў нашай краіны, падзяліліся са здымачнай групай асабістымі гісторыямі і сустрэліся з зорнымі настаўнікамі праекта — Русланам Аляхно, Сяргеем Саседавым, Сяргеем Пархоменкам (вядомым як Сэрога) і Вольгай Бузавай. Тыя, каму пашчасціла пачуць запаветнае «так» пасля сваіх выступленняў, прайшлі інтэнсіўную і разнапланавую падрыхтоўку да вялікай сцэны ў трэніровачным лагеры праекта, дзе выконвалі творчыя заданні. Пра тое, хто са шчаслівучыкаў дакажа аўтарытэтным настаўнікам і тэлеаўдыторыі, што варты першага беларускага «Х-фактару», даведаемся ў прамым эфіры ў снежні.

А вось пра тое, што засталося за кадрам насычаных здымак першага беларускага шоу-праекта «Х-фактар у Беларусі», даведацца зможам з відэадзённікаў. Ужо ў гэтыя выхадныя тэлеглядачоў чакаюць два вялікія спецвыпускі. Прыхільнікам шоу пакажуць цэлыя 26 хвілін эмоцый, размоў і спеваў... Папярэднічалі гэтаму паказы скарочаных версій дзённікаў (відэаролікі працягласцю 2,5 хвіліны пачалі выходзіць у эфіры 20 верасня). І ў іх можна было знаёміцца з удзельнікамі адборачных тураў праекта з розных рэгіёнаў Беларусі. Так, цяпер маем магчымасць перанесціся ў падзеі перадкастынгавай вясны і паназіраць за тымі таленавітымі беларусамі, што вырашылі скарыстацца шанцам заявіць пра сябе і паспытаць удачу на адборах. А 9 кастрычніка ў тэлеэфіры стартуе першы выпуск «Х-фактар у Беларусі». І ўжо зараз сачыць за падзеямі праекта тэлеаўдыторыя можа як у тэлеэфіры, так і на YouTube-канале шоу. Глядзіце, вызначайцеся са сваімі фаварытамі і хварэйце за іх, бо ім вельмі важна адчуваць нашу падтрымку.

## Музычныя акцэнты на «Беларусь 3»

**У наступную пятніцу, 1 кастрычніка, будзе адзначацца Міжнародны дзень музыкі. Вядома, гэтая падзея знойдзе адлюстраванне ў эфіры сацыякультурнага тэлеканала. Нас чакаюць канцэрты і выпуск праграмы «Камертон», дзе героем стаў дырыжор Аляксандр Сасноўскі. А ўжо ў гэтыя выхадныя ўсіх прыхільнікаў музыкі тут парадуюць прэм'ерай...**



Улетку тэлеканал «Беларусь 3» сумесна з сімфанічным аркестрам медыяхолдынга пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора Аляксандра Высоцкага распачаў запіс цыкла тэматычных канцэртных праграм, прысвечаных гісторыі беларускага акадэмічнага музычнага мастацтва.

І вось у вячэрнім эфіры 25 і 26 верасня гледачоў сацыякультурнага тэлеканала чакаюць вечары з сімфанічным аркестрам. Канцэрт «Беларускія вытокі», дзе прагучыць музыка кампазітараў XIX стагоддзя — Караля Ельскага, Плашыны, Язэпа Казлоўскага, Напалеона Орды і Станіслава Манюшкі — будзе трансліравацца ў суботу. А ў нядзелю аўдыторыя пачуе і ўбачыць канцэрт «Чатыры стагоддзі», дзе прагучаць тэатральныя творы беларускіх кампазітараў. Сярод аўтараў — Ян Давід Голанд, Станіслаў Манюшка, Анатоль Багатыроў, Яўген Глебаў, Кацярына Шымановіч, Вячаслаў Кузняцоў, Галіна Гарэлава, Генрых Вагнер, Уладзімір Солтан і Сяргей Картэс.

Што да святочных акцэнтаў у Міжнародны дзень музыкі, то тэлеканал нам прапануе канцэрты пераможцаў конкурсу «Маладыя таленты Беларусі». Эстраду і фальклор для аўдыторыі падрыхтавалі ў дзённым эфіры, а позна вечарам меламанаў чакае канцэрт класікі.

**Алена ДРАПКО.**


### «Смачная восень са «Звяздой»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або II паўгоддзе 2021 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 14 кастрычніка 2021 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 22 кастрычніка 2021 года будуць разыграны 7 тостараў Galaxy GL 2909 і суперпрыз — мультыварка Holt HT-MC-005. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 30 кастрычніка 2021 г.



Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 снежня 2021 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2021 г. і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Смачная восень са «Звяздой» чытайце ў нумары 164 газеты «Звязда» ад 27.08.2021 года.



**Тэлефон для даведак (017) 271 81 53.**

**Тэрмін правядзення гульні — з 01.09.2021 да 31.12.2021.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4064 ад 20.08.2021 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.


**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або II паўгоддзе 2021 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______________________

______________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ______________________
*(аддзяленне сувязі)*

______________ **на IV квартал або II паўгоддзе 2021 года**

**Хатні адрас і тэлефон** *(абавязкова)* [______] *(індэкс)* ______

______________________

______________________

Удачы ў розыгрышы!

# панядзелак, 27 верасня

## ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 1.15** Зона Х (16+).
**8.50** Слова Мітрапаліта Веніяміна на свята Узвышэння Святога Крыжа.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Меладрама «Паромшчыца» (16+).**
**13.05, 15.25 Меладрама «Скажы мне праўду» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**22.00** Спецыяльны рэпартаж АТН.
**22.15 Серыял «След» (16+).**
**1.00** Арэна.
**1.35** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» Ранішняе шоу (12+).
**9.00, 19.35** Тэлебарометр.
**9.05, 20.05** «Зразумець. Дараваць». (16+).
**10.30** Камень, нажніцы, папера (16+).
**11.10** «На тыдзень» (16+).
**12.05 Трылер «Беглы ў лабірынце» (12+).**
**14.15 Анімацыйны фільм «Маана» (0+).**
**16.05 Серыял «Стыч!» (6+)**
**17.00** «Суперлато».
**17.40** «Арол і рэшка. Перазагрузка-3» (16+).
**18.30** «Сакрэтны мільянер» (16+).
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.20** «Тата папаў» (16+).
**23.20** Хачу ў тэлевізар!

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Рэзнікі і госці кісель.
**8.05, 12.00, 19.40, 23.30** Навіны культуры.
**8.25** «Размовы пра духоўнае». Свята Узвіжанне Крыжа Гасподняга (прав.).
**8.35** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.25, 15.45 «Конік». Маст. фільм (12+).**
**10.55** «Кадры жыцця». Урач, тэлежурналіст Аляксандр Цярэшчанка.
**11.45** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**12.20** «Беларуская кухня». Смятаннік, адтопленае малако.
**12.50** «Наперад у мінулае».
**13.15, 21.05** «Апошні дзень». Надзея Румянцава (12+) [СЦ].
**13.55, 21.40 «Жанаты халасцяк». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**15.20** «Камертон». Рэжысёр, прадзюсар, кампазітар Сяргей Зайцаў.
**17.15** «Люблю і памятаю».
**18.00 «Уцёкі». Маст. фільм (12+).**
**20.00** «Сваімі словамі».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.15** «Крылы Перамогі». Фільм шосты.

### Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.15, 9.10** Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі.
**9.55** Вынікі тыдня.
**10.40** Тэніс. ВТА.
**12.45** Плаванне. Ліга ISL.
**14.50** Вяліки спорт.
**15.35** Міні-футбол. Чэмпіянат свету. 1/4 фіналу.
**17.35** На грані фолу. Футбольны агляд.
**19.00** Хакей. КХЛ.
**21.30** Вось гэта спорт!
**21.50, 23.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі.

### АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.20** Нашы навіны.
**9.10** Контуры.
**10.10** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15, 23.40 Серыял «Курт Сеіт і Аляксандра» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.15** «Прапаганда» (16+).
**21.35 Серыял «Рускія горкі» (16+).**

### СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны»
**8.40** «Тыдзень».
**10.40, 00.10** «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
**11.35** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.35, 20.45** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.20** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.35, 16.50** Дакументальны спецпраект (16+).
**18.30** «Па сутнасці».
**20.15** «СТБ спорт».
**20.20** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Міншчына».
**22.00** «Скардзіцца дазваляецца».
**23.15** «СТБ спорт».
**0.55** «Самая карысная праграма» (16+).
**1.50** «Мінтранс» (16+).

### МІР

**5.00, 10.10, 4.40 Серыял «Меч» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 2.00** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 18.00, 2.45, 3.30** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 16.20, 3.55** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.00** «Міравое пагадненне» (16+).
**19.25, 20.15** «Гульня ў кіно» (16+).
**21.00, 22.00** «Назад у будучыню» (16+).
**22.55** «Сусветныя гульні розуму» (16+).
**23.25 Серыял «Не думай больш і ўспомні» (16+).**

### РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Таямніцы Беларусі» (16+).
**12.45** «У людзях».
**13.35** «Плюс мінус». Надвор'е на тыдзень.
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30 Маст. фільм «Рыфмуецца з любоўю» (12+).**
**17.15** «60 хвілін».
**18.30** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.05 Серыял «Шуша» (16+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

### НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.15** Спорт-мікс.
**6.25** «Здароўе» (12+).
**7.20, 8.25, 10.25 Фільм «Кіроўца аўтобуса» (12+).**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00 Фільм «Чалавек з чорнай «Волгі» (12+).**
**13.25** Надзвычайнае здарэнне.
**13.50 Серыял «Чужы раён» (16+).**
**16.20, 19.40, 21.45, 23.20** Сёння. Галоўнае.
**16.30** Прэм'ера. «За гранню» (16+).
**17.30** «ДНК» (16+).
**18.35, 19.55, 22.10, 23.35 Серыял «Шэф. Вяртанне» (16+).**
**21.50** «НЗ.by».

### 8 канал

**7.00, 15.10, 17.45, 21.00, 1.05** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** Мультпарад. «Свет Юрскага перыяду: лагер Мелавога перыяду» (6+).
**7.30, 20.40** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Дзённік геймера» (12+).**
**8.20 Камедыя «Кароткае замыканне» (12+).**
**10.00, 15.30 Серыял «Служба выратавання 911» (16+).**
**10.45 Серыял «Інданезія» (12+).**
**11.45 Трылер «Дэдпул» (18+).**
**13.35 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**15.15** «Мультпарад» (0+).
**15.25, 18.35** «Хачу ў Парыж» (12+).
**16.15 Серыял «Чорна-белае каханне» (16+).**
**17.50 Серыял «Тэорыя Вялікага выбуху» (16+).**
**18.40 Серыял «Хатні арышт» (16+).**
**19.50 Серыял «Экспрапрыятары» (16+).**
**20.45** «Вечарніца» (0+).
**21.05 Трылер «Адвакат д'ябла» (16+).**
**23.30 Трылер «Назіральнік» (18+).**

# нядзеля, 3 кастрычніка

## ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

### ВТБ

**6.05** «Раніца з гумарам». Дайджэст (16+).
**8.05** «Лаві момант» (16+).
**9.00** М/ф «Лекс і Плу» (6+).
**9.25** М/ф «Тры каты» (0+).
**9.50** М/ф «Царэўна» (6+).
**10.20** «Руская не смяюцца» (16+).
**11.25, 1.40** «Проста кухня» (16+).
**12.00** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**12.40** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**14.05** Анімацыйны фільм «Рэальная белка» (0+).
**15.50, 18.25** Серыял «Кухня» (16+).
**21.00** «Уральскія пельмені» (16+).
**22.35** «Велабайкі» (16+).
**23.10** «Наш рамонт» (16+).
**23.50** «Кіно ў дэталях» (16+).
**0.45** «Рогаў у справе» (16+).
**2.10** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**3.20** «Даеш моладзь» (16+).
**5.00** «6 кадраў» (16+).

### Культура

**6.30** «Загадкавая планета», «Канёк-Гарбунок».
**8.00** «Вялікія і маленькія».
**10.00** «Мы — грамацеі!»
**10.45** «Развітальныя гастролі». Фільм [СЦ].
**11.55** Лісты з правінцыі [СЦ].
**12.25** Дыялогі пра жывёл [СЦ].
**13.10** Неўскі каўчэг. [СЦ].
**13.35** «Абсалютны слых».
**14.15** «Гульня ў бісер».
**15.00** «Два Фёдары». Фільм [СЦ].
**16.30** «Карціна свету з Міхаілам Кавальчуком».
**17.10** XXX Цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў Першай тэатральнай прэміі «Крыштальная Турандот» у музеі-сядзібе «Архангельскае».
**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ прыём грамадзян па асабістых пытаннях правёў у Ганцавічах.**



Жыхары раёна звярнуліся да сенатара па пытаннях, што датычацца падаткаабкладання, удасканалення заканадаўства, землекарыстання, атрымання арэнднага жылля і іншых актуальных тэм. Па ўсіх зваротах парламентарый даў тлумачэнні падчас прыёму.

У другой палове дня старшыня профільнай камісіі сустрэўся з калектывам Ганцавіцкага хлебазавода, расказаў работнікам аб структуры Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, яго функцыях, праінфармаваў аб палітычнай сітуацыі ў краіне, якая склалася, заваструў увагу на важнасці вакцынацыі ад COVID-19, распавёў аб падрыхтоўцы да правядзення канстытуцыйна-прававой рэформы.

* * *

**На прыём да старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргея РАЧКОВА, які праводзіўся ў Лунінецкім райвыканкаме, прыйшлі сем чалавек, якія ўзнялі дванаццаць пытанняў.**



Дарэчы, падчас паездкі ў Брэсцкую вобласць сенатар наведаў таксама ААТ «Лунінецкі малочны завод», спартыўны комплекс з басейнам «Дэльфін», а таксама лядовую арэну «Алімп-2011», дзе правёў сустрэчы з працоўнымі калектывамі. Таксама Сяргей Рачкоў азнаёміўся з рэканструкцыяй корпуса пад інфекцыйнае аддзяленне Лунінецкай цэнтральнай раённай бальніцы.

* * *

**Член Савета Рэспублікі Аляксандр КАРПІЦКІ правёў прамую лінію і прыём грамадзян у Брэсце.**



Да члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, галоўнага ўрача Брэсцкай абласной клінічнай бальніцы на прамую лінію паступілі два званкі, якія датычацца сферы аховы здароўя: вакцынацыі ад грыпу жыхара Брэста і шпіталізацыя ў інфекцыйнае аддзяленне з каранавіруснай інфекцыяй жыхаркі Камянецкага раёна. Узнятыя заяўнікамі праблемы вырашаны падчас правядзення прамой лініі.

На асабісты прыём звярнулася шэсць чалавек. Агучаныя імі пытанні датычыліся будаўніцтва дарогі па вуліцы Праляскова ў Брэсце, работы праўлення аднаго з жыллёвых кааператываў, выдзялення месца дзіцяці ў групе падоўжанага дня ў адной са школ, працаўладкавання, вызвалення ад працы па сумяшчальніцтве педагога, аплаты электраэнергіі і прыпынення яе падачы. Усе пытанні ўзятыя на кантроль.

* * *

**Член Савета Рэспублікі Рыгор ПРАТАСАВІЦКІ правёў асабісты прыём грамадзян для жыхароў Столінскага раёна.**

Да сенатара звярнуліся пяць жыхароў раёна. Звароты, якія паступілі, датычыліся жыллёвых пытанняў, вяртання грошай за аўтамабіль пастаўленны адной з фірм, запазычанасці па заработнай плаце, абслугоўвання інваліда дома.

Парламентарый даручыў адпаведным службам разабрацца з агучанымі заяўнікамі праблемамі і праінфармаваць іх, а па шэрагу пытанняў даў неабходныя тлумачэнні.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

КОНКУРС

# «Цэнтральны» стаў першым

**Дэпутаты Мінскага гарадскога Савета падвялі вынікі агляду-конкурсу сярод калегіяльных органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (КОТГС) сталіцы.**

На конкурс традыцыйна вылучаюцца па адным КОТГС ад кожнага з дзевяці раёнаў сталіцы. Потым члены Пастаяннай камісіі па галоснасці, самакіраванні і парадку на працягу двух верасНёўскіх дзён зрабілі аб'езд арганізацый — кандыдатаў у пераможцы, сустрэліся з іх прадстаўнікамі. Дэпутаты цікавіліся рознымі аспектамі дзейнасці найлепшага ў канкрэтным раёне КОТГС. У першую чаргу тым, як і па якіх кірунках ідзе ўзаемадзеянне яго ўдзельнікаў з мясцовым насельніцтвам і ўладамі раёна ў сферы развіцця і распаўсюджвання самакіравання, што замінае гэтай рабоце, якія ёсць прапановы і ідэі.

Члены Пастаяннай камісіі таксама вывучалі і канкрэтныя рэчы, у прыватнасці, якая работа вядзецца з ветэранамі, адзінокімі старымі, са шматдзетнымі сем'ямі, моладдзю, як арганізаваны адпачынак насельніцтва, ажыццяўляецца прафілактыка правапарушэнняў і г. д. Згодна з гэтымі крытэрыямі, удзельнікі конкурсу атрымлівалі адпаведныя балы.

**Старшыня Мінгарсавета Андрэй БУГРОЎ** гаворыць, што ў новых сучасных мікраравёнах станаўленне і развіццё КОТГС ідзе хутчэй, чым у кварталах забудовы першых пасляваенных пяцігодак, дзе сярод жыхароў большасць людзей сталага ўзросту. Што і заканамерна. Маладыя людзі і людзі сярэдняга ўзросту больш рухомыя, яны актыўней адгукаюцца на запыты часу. Тым не менш, дэпутаты пасля пэўнай дыскусіі і абмену думкамі першае месца аддалі КОТГС «Цэнтральны» Ленінскага раёна, другое — КОТГС № 42 Савецкага раёна і КОТГС № 128 Фрунзенскага. На трэцім месцы аказаліся КОТГС № 1 Заводскага, КОТГС № 110 Першамайскага і КОТГС № 34 Цэнтральнага раёнаў.

Заўважым, у адпаведнасці з умовамі гарадскога конкурсу, пераможцаў чакае матэрыяльнае заахвочванне. Традыцыйна палова ўзнагароджвання пойдзе на развіццё органа тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, астатнія грошы — на заахвочванне актывістаў КОТГС.

Адзін з важных і, бадай, галоўных крытэрыяў конкурсу — добраўпарадкаванне падведамаснай КОТГС тэрыторыі, удзел жыхароў у рамонце сваіх дамоў і пад'ездаў. Дарэчы, выдатны ўзор — пераўтварэнне пад'езда дома № 30 па вуліцы Карла Маркса, у чым вялікая заслуга вышэйназванага КОТГС «Цэнтральны». Жыхары гэтага дома таксама прывялі ў парадак і свой дворык, замянілі там грунт, разбілі прыгожы газон, карацей, упрыгожылі на зайздрасць усім. І, што вельмі важна і актуальна, зрабілі гэта за ўласныя сродкі, прычым немалыя. Але галоўнае нават і не ў гэтым, а ў тым, што група мінчан-аднадумцаў стварыла не толькі новы прывабны выгляд пад'езда, а па сутнасці, камфортнае і ўтульнае асяроддзе для жыцця. Невыпадкова гэты пад'езд быў прызнаны найлепшым пад'ездам горада 2020 года.

Па словах Андрэя Бугрова, неабыякавыя людзі жывуць у кожным раёне, на кожнай вуліцы, у кожным доме сталіцы. На іх рахунку — шмат карысных спраў. У Фрунзенскім раёне яго жыхары аднаўляюць месцы адпачынку гараджан, добраўпарадкоўваюць спартыўныя пляцоўкі і г. д. Жыхары Цэнтральнага раёна вызначыліся стварэннем прыгожых клумбаў. І такіх прыкладаў дзясяткі.

— На думку нашых дэпутатаў, такія конкурсы стымулююць паступовае ўключэнне ў працэсы мясцовага самакіравання ўсё большай колькасці мінчан, садзейнічаюць удасканаленню работы органаў грамадскага самакіравання. У гэтым сэнсе нядаўні агляд-конкурс калегіяльных органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання — пэўны стымул і нагода для дэпутатаў яшчэ раз паглядзець як на здабыткі, так і заняцца вырашэннем і праблемных пытанняў, што патрабуюць увагі і намаганняў, — гаворыць старшыня Мінгарсавета.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# ПА ГРАФІКУ І Ў РЭЗЕРВОВЫ ДЗЕНЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*



**Аляксандр ЗАВЕРАЧ, старшыня Хомскага сельскага Савета Драгічынскага раёна:**

— У нас сістэма адпрацаваная, дзейнічае некалькі гадоў, пакуль не дае збояў. На ўборцы бульбы задзейнічаны два камбайны індывідуальных прадпрымальнікаў. Уборка цалкам механізаваная, клубні дастаўляюцца на падворак гаспадару.

У Хомску няма ранейшага сельгаспрадпрыемства, яго былыя землі выдзелены фермерскай гаспадарцы «Драгічын-Агра», якая мае іншую спецыялізацыю, бульбы не садзіць, таму і не мае адпаведнай тэхнікі. Гэты фактар улічылі індывідуальныя прадпрымальнікі і ў свой час набылі бульбаўборачныя камбайны. У пачатку восені яны збіраюць заяўкі, складаюць графік работы. Таму кожны загадзя ведае, у які дзень выкапаюць яго соткі. За дзень камбайн убірае ад аднаго да паўтара гектара. Па Хомску з насельніцтвам 1167 чалавек пад пасадку бульбы адведзена каля 50 гектараў. У астатніх дзевяці населеных пунктах плантацыі ў разы меншыя, але вяскоўцы ведаюць, што бульба будзе выкапана своечасова, адпаведна з графікам. Нават адзінокая пенсіянерка з самай аддаленай вёскі не мае падстаў непакоіцца. Яе ўчастак выкапаюць і прывязуць ураджай дадому, застанецца толькі перабраць. Цэны на паслугі ўстанаўліваюць, лічу, у межах разумнага, людзі ведаюць расцэнкі загадзя.

Нашы ІП аказваюць паслугі таксама жыхарам іншых сельсаветаў, нават выязджаюць у населеныя пункты Бярозаўскага раёна. Ім жа за сезон трэба зарабіць, — адзначае Аляксандр Мікалаевіч.

**Мікалай БАСАЛАЙ, старшыня Стайкаўскага сельскага Савета Івацэвіцкага раёна:**

— Хачу адразу зазначыць, што бульбы ў нас з кожным годам садзяць усё менш і менш. Калі раней тыя ж Стайкі з тысячным насельніцтвам засявалі бульбай поле ў 40 гектараў, яшчэ некалькі гадоў таму пад соткі аддзілі да 30 гектараў, то сёлета пасадзілі другога хлеба толькі 12 гектараў. У нас глеба каменістая, тэхніка часта ламаецца, што ў сваю чаргу ўплывае на кошт паслуг. Таму людзі пакрысе і змяншаюць свае надзелы.

А ўчасткі пад бульбу вяскоўцам выдзяляе сельвыканкам увосень, акрамя тых, хто працуе на пастаяннай аснове ў сельгаспрадпрыемствах, ім выдзяляюць соткі на працы. Асенняя дзяльба праводзіцца па просьбе жыхароў, некаторыя лічаць патрэбным узараць свае соткі на зіму. Паслугі па пасадцы і апрацоўцы аказвае мясцовая гаспадарка. А вось выкапаць — гэта клопат саміх жыхароў. Так склалася традыцыйна. Рэч у тым, што многія сельчане маюць свае трактары з прычапнымі агрэгатамі. Яны капаюць не толькі сабе, але і ўсім суседзям, аднавяскоўцам. І на ўборку бульбы, як правіла, з'язджаюцца гарадскія дзеці ды іншыя сваякі. За дзень кожны гаспадар стараецца прыбраць сваё поле.

**Алена СІНЮЦІЧ, старшыня Ласіцкага сельскага Савета Пінскага раёна**

— Варта сказаць спачатку, што наш сельсавет адзін з самых невялікіх па колькасці насельніцтва (пражывае каля 880 чалавек) і адзін з самых аддаленых ад райцэнтра. Многія жыхары перасягнулі 70-гадовы рубеж, яны ўжо бульбу на сотках не садзяць. Купіць мех-два для сям'і з двух альбо аднаго чалавека — не праблема, а некаторым, заслужаным ветэранам калгаснай працы, гаспадарка і бясплатна пуд бульбы даставіць. У сельгаспрадпрыемстве ААТ «Ласіцк» застаўся бульбаўборачны камбайн, сама гаспадарка садзіць толькі невялікае поле для патрэб сталоўкі, бульбаўборачную машыну выдзяляюць для ўборкі сотак. Дык вось за мінулыя выхадныя ўсе прыватныя надзелы былі ўбраны, прывезены, людзі паспелі нават перабраць і ссыпаць ураджай у склеп. Так што на нашай тэрыторыі бульба сабраная.

**Людміла ДУБОЎСКАЯ, старшыня Дзяніскавіцкага сельскага Савета Ганцавіцкага раёна:**

— У нас сельсавет невялікі, яго ўтварае адна вёска. Праблем з уборкай бульбы на полі асаблівых няма, гаспадарам дапамагаюць прыватныя прадпрымальнікі альбо суседзі, што маюць тэхніку. Хачу сказаць яшчэ вось аб чым. У нас ёсць пажылыя пенсіянеры, працаўнікі, якія не адмаўляюцца ад пасадкі другога хлеба, бо не ўяўляюць сабе жыццё ў вёсцы без бульбы. І хоць на прысядзібных агародах, але некалькі сотак садзяць. Такім дапамагаюць ва ўборцы сацыяльныя работнікі, часам просім у парадку шэфскай дапамогі папрацаваць гадзіну ці дзве старшакласнікаў. Хлопцы і дзяўчаты дапамагаюць пажылым аднавяскоўцам.

**Валерый ГЕРМАН, старшыня Жамчужненскага сельскага Савета Баранавіцкага раёна:**

— У нас гэты працэс арганізаваны вельмі дакладна. Найбуйнейшае ў раёне сельгаспрадпрыемства ААТ «Птушкафабрыка «Дружба» праяўляе клопат аб сваіх працаўніках і ветэранах вытворчасці. Бульбу садзяць не толькі жыхары пасёлка Жамчужны, але і жыхары 14 вёсак былой гаспадаркі «Цяплівады». Для працаўнікоў, а таксама супрацоўнікаў галіны сацкультбыту, маю на ўвазе настаўнікаў, медыкаў, гандлёвых работнікаў, паслугі аказваюцца па сабекошце. Для пенсіянераў ёсць магчымасць пасадзіць, апрацаваць і выкапаць 8 сотак бульбы бясплатна. Усе клопаты бярэ на сябе сельгаспрадпрыемства.

Уборка бульбы пачынаецца звычайна з першых дзён верасня, і да 20 верасня ўсё з палёў збіраецца. Складаецца графік, кожны гаспадар ведае свой дзень, калі ён павінен прыйсці ў поле, каб сабраць клубні. Працуюць капалкі адразу на некалькі ўчасткаў, замацаваны грузавікі, якія адвозяць ураджай па падворках. Для тых, у каго ўзніклі надзвычайныя абставіны, прадугледжаны рэзервовы дзень. Але людзі стараюцца вызваліць свой дзень уборкі ад асноўнай работы, запрашаюць сваякоў на падмогу. На палях у такія дні шматлюдна, работа кіпіць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# Прэмій Мінгарсавета стане больш

**Днямі ў Мінску найлепшым вучням сталіцы ўручылі 100 прэмій Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў. Цырымонія прайшла ва ўрачыстай атмасферы ў гарадской ратушы.**

Нягледзячы на юны ўзрост, а гэта навучэнцы 9—11-х класаў, лаўрэаты прэміі, можна сказаць, ужо адбыліся як асобы. Яны дасягнулі высокіх вынікаў у вучобе, ярка праявілі сябе ў інтэлектуальных спаборніцтвах на нацыянальных і міжнародных турнірах, конкурсах і алімпіядах, маюць творчыя і спартыўныя дасягненні.

Як юнакі і дзяўчаты становяцца пераможцамі? Спачатку найлепшых у кандыдаты на прэмію назвалі педагогі школ і гімназій, а затым іх прапановы разгледзела спецыяльная камісія гарадскога камітэта па адукацыі. Яна і выбрала 100 маладых людзей.

Але, як прызнаўся старшыня Мінгарсавета Андрэй Бугроў, сто прэмій — гэта сціплая для маштабаў дзвюхмільённай сталіцы лічба. У Мінску сёння больш за 200 школ і гімназій. І ў кожнай з іх ёсць вартыя высокай узнагароды гарадскога Савета. Таму яго дэпутаты зараз разглядаюць магчымасць павелічэння колькасці такіх прэмій, адзначыў суразмоўнік.

**Мікалай ЛЮБЧАНСКІ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

**www.zviazda.by**

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 23 верасня 2021 года.**

# ІНДЫКАТАР ЖАНОЧЫХ ПРАБЛЕМ



## Чаму ў дэкальтэ галоўнае не прыгажосць, а здароўе

**У 2013 годзе галівудская актрыса, пасол добрай волі ААН і сусветны інфлюэнсер Анджаліна Джалі выдаліла малочныя залозы. Генетычны аналіз выявіў мутацыю гена BRCA1, якія павысіў верагоднасць развіцця раку малочнай залозы на 87 працэнтаў. Рашэннем засцерагчы сябе ад анкалогіі знакамітасць запусціла сярод жанчын усяго свету трэнд — клапаціцца пра здароўе грудзей. Аднак у яго ёсць і адваротны бок. Знайшоўшы ў грудзях невядомы «шарык» ці ўшчыльненне, амаль кожная пачынае адразу думаць аб найгоршым. Ад інфармацыі ў інтэрнэце становіцца страшна, аўтарытэтная медыцынская літаратура пужае незразумелымі тэрмінамі... Але прычына для панікі ёсць не заўсёды. Часта незразумелы «шарык» можа быць, напрыклад, фібрадэномай — дабраякаснай пухлінай малочнай залозы, амаль што бяспечнай.**


Фота Аліны МАЗАВЕЦ.

«Звязда» з дапамогай **урача-анколага, загадчыка кансультатыўна-анкалагічнага аддзялення Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага цэнтра Канстанціна ШЫШКО** адказала на важныя, нават нядарэчныя пытанні — шчыра і без складаных медыцынскіх тэрмінаў.

**— Канстанцін Аляксеевіч, растлумачце, калі ласка, у чым розніца паміж дабраякаснай і злаякаснай пухлінамі. І чаму фібраадэнома — дабраякасная?**

— Дабраякасныя пухліны абсалютна бяспечныя для жыцця. Ад іх вельмі складана памерці — можна, канешне, але складана. Яны ніколі не даюць метастазаў. А злаякасныя пухліны даюць метастазы ў лімфавузлы, косці, іншыя органы. Гэта асноўнае адрозненне. Адрозніваюцца яны і формай росту. Дабраякасныя ўтварэнні растуць, рассоўваючы навакольныя тканкі, а злаякасныя — прарастаюць у іх. Так і фібраадэнома расце, рассоўвае тканкі навокал, вызваляючы сабе месца для росту.

**— Дабраякасная фібраадэнома можа перараджацца ў злаякасную?**

— Згодна з многімі аўтарамі, класічныя фібраадэномы не перараджаюцца ў злаякасныя пухліны. Я за 10 гадоў працы ў аддзяленні толькі адзін раз бачыў рак у фібраадэноме. Што першаснае, а што другаснае — сказаць не магу. Там была пачатковая стадыя раку, пацыентку прааперыравалі, і з ёй усё добра. Ёсць яшчэ такая рэч, як лістападобная пухліна, яна ж філоідная фібраадэнома. Такія пухліны маюць схільнасць да перараджэння, толькі не ў рак, а ў саркому — агрэсіўную злаякасную пухліну малочнай залозы. Але працэнт такіх пухлін ад агульнай колькасці вельмі невялікі. Іх адметнасць — у вельмі хуткім росце: літаральна за тры месяцы яны могуць вырасці ў два-тры разы. Прытым, што спачатку могуць быць дабраякаснымі, але здольныя перараджацца. І тады такую пухліну трэба выдаляць, а потым назіраць. Калі яна не рэцыдывуе, паколькі мае такую здольнасць, то ўсё добра. А класічныя фібраадэномы могуць з'явіцца і не расці ці памяншацца, у некаторых выпадках — нават знікаць.

**— Увогуле, у чым прычына ўзнікнення фібраадэном?**

— Вялікага сакрэту тут няма. Фібраадэнома — гэта вынік змяненняў у арганізме. Як правіла, гэта збой эндакрынных функцый: яечнікі, шчытападобная залоза, гіпофіз. Гэтыя тры залозы і даюць штуршок развіццю фібраадэном. Сваю ролю адыгрываюць знешнія фактары: стрэс, кава, курэнне. Лічыцца, што харчаванне ўплывае. Вельмі часта яны сустракаюцца ў маладых, у іх змяняецца гарманальны фон пры палавым паспяванні ці цяжарнасці. Кантрацэптывы — гэта ж таксама гармоны. Ну і яны проста любяць маладых.

**— Ну, стрэсам, кавай і няправільным харчаваннем у наш час нікога не здзівіць...**

— Таму ў 10 працэнтаў жанчын, па адкрытых даных, ёсць фібраадэномы. За паліклінікамі горада Мінска замацавана прыкладна 1,5 мільёна дарослых людзей. Умоўна будзем лічыць, што 50 працэнтаў з іх — жанчыны, хоць іх і больш. То-бок, 700—800 тысяч чалавек. Ад 800 тысяч 10 працэнтаў — гэта 80 тысяч жанчын толькі ў Мінску сутыкаліся з фібраадэномай. Нават па прыкладных разліках гэта вялікая лічба.

**— Сярод усіх пухлін малочнай залозы пераважаюць дабраякасныя ці злаякасныя?**

— Калі б у нас было 80 тысяч выпадкаў раку ў Мінску, было б сумна. Таму, канешне, пераважаюць дабраякасныя. І ўвогуле дабраякасныя сустракаюцца часцей і ў іншых органах. Але, на жаль, нашы анкамамолагі не пакутуюць ад недахопу працы.

**— А якія падставы для выдалення фібраадэном?**

— Першая прычына — яе хуткі рост, калі мы падазраем, што можа быць філоідная пухліна. Часта пры правядзенні біяпсіі цяжка цыталагічна адрозніць звычайную фібраадэному і філоідную пухліну. Выдаляюцца фібраадэномы вялікіх памераў, якія цісняць на грудзі, крыватокі, выклікаюць касметычныя дэфекты. Таксама, калі плануецца цяжарнасць, іх трэба выдаляць. Цяжарнасць — гэта гарманальны ўсплёск, і ёсць рызыка, што пухліны пачнуць расці. Таму іх лепш прыбраць загадзя. Калі фібраадэномы знайшлі падчас цяжарнасці, то проста назіраюць дынаміку іх росту. Невялікая пухліна на перыферыі не перашкаджае нават пры кармленні грудзямі.

**— Канстанцін Аляксеевіч, выдаляць бяспечныя фібраадэномы мэтазгодна?**

— Я лічу, што фібраадэномы ў першую чаргу трэба назіраць і шукаць прычыну іх з'яўлення. А часта дзейнічаюць па прынцыпе «знайшлі фібраадэному і наперад — выдаляць». Насамрэч, фібраадэнома — гэта вынік, і трэба шукаць прычыну, часцей за ўсё, у гінекалогіі ці эндакрыналогіі. А так, ну выдалім, а праз паўгода іх будзе пяць. Выдалім пяць — з'явіцца 25. На жаль, сустракаюцца выпадкі, калі ў жанчыны па 25 фібраадэном у грудзях. Вырасла адна, ну і вырасла, такое здараецца. Але, калі яны пастаянна з'яўляюцца, значыць, трэба не ганяцца за выдаленнем, а пашукаць і ліквідаваць прычыну. А прычынамі павінны займацца гінеколагі і эндакрынолагі, у ідэале — гінеколаг-эндакрынолаг, але такіх спецыялістаў у нас мала.

**— Чаму пацыентак з фібраадэномамі накіроўваюць да анколагаў?**

— У ідэале фібраадэномамі павінна займацца агульная ўрачэбная сетка з кансультацыяй анколага пры неабходнасці. Па 17-м пастанаўленні Міністэрства аховы здароўя, грудзі — гэта «вотчына» гінеколага. У гінеколагаў ёсць інфармацыя, як лячыць малочныя залозы, як абследаваць і куды накіроўваць пацыентаў. Яны павінны самі зрабіць пункцыю і накіраваць да анколага верыфікаванага пацыента. Іншая справа, што цяпер у краіне каранавірус, многія стацыянары зачынены, і анкалагічны цэнтр узяў гэтую праблему на сябе.

**— Вельмі часта сустракаецца такая рэч, як мастапатыя. Што гэта такое і наколькі яна распаўсюджаная?**

— Мне цяжка знайсці жанчыну, якой хоць бы раз у жыцці паставілі адсутнасць дыфузнай фіброзна-кістознай мастапатыі. Такія, канешне, ёсць, але вельмі мала. Мастапатыя — гэта такі стан малочнай залозы, калі назіраецца залішняе развіццё фібрознай тканкі, з'яўленне кістаў. Гэта самая распаўсюджаная паталогія малочнай залозы. Па розных крыніцах, з ёй сутыкаецца 60 працэнтаў жанчын. Касметычна яна ніяк не праяўляецца, але можа нагадваць аб сабе болем у грудзях.

**— Часцей за ўсё для лячэння мастапатыі прапісваюць гамеапатычны прэпарат мастадынон, у складзе якога — лекавыя расліны. Наколькі гэта мэтазгодна?**

— Калі праблема — у мінімальных збоях арганізма, то раслінныя прэпараты з імі спраўляюцца. Іх трэба прымаць доўгімі курсамі па некалькі месяцаў, і эфект будзе. А больш сур'ёзныя лекі павінны быць накіраваны на прычыну і яе ліквідацыю. Калі мы кажам, напрыклад, аб павышэнні ўзроўню пралакціну, то ёсць прэпараты, якія блакіруюць яго выпрацоўку.

**— Якія асноўныя рэкамендацыі пры прафілактыцы фібраадэном?**

— У першую чаргу — адмаўленне ад курэння, аптымальная бялізна (яна не павінна быць надта грубай, не павінна мець металічных уставак, якія цісняць на грудзі), не ўжываць каву, пазбягаць стрэсаў. Банальныя рэчы. І раслінныя прэпараты ў пэўнай ступені на іх уплываюць: крыху зніжаюць стрэс, нармалізуюць гарманальны фон. Калі паглядзець з іншага боку, навошта жанчыне грудзі? Каб карміць дзяцей. У нашай краіне жанчыны нараджаюць у сярэднім дваіх дзяцей. Грудзі не выконваюць сваю галоўную функцыю — вось у чым сутнасць. Так, ёсць жанчыны, у якіх больш дзяцей, і ў іх фібраадэном няма. Але сустракаюцца выключэнні, калі жанчына нарадзіла трох-чатырох дзяцей і мае фібраадэномы.

**— Калі ў жанчыны збіваецца цыкл менструацыі, гэта сведчыць аб гінекалагічных праблемах. А можа быць, што гэта праблемы з грудзямі?**

— Не. Цыкл збіваецца праз гінекалагічныя ці эндакрынныя праблемы. Фібраадэнома, дыфузна-фіброзна-кістозная мастапатыя, рак малочных залоз — гэта вынік праблем у арганізме. Грудзі — індыкатар такіх праблем. І таму, на мой погляд, заўсёды трэба лячыць прычыну. Напрыклад, пры мастапатыі прызначаюць гарманальныя гелі, яны ліквідуюць сімптаматыку, здымаюць боль. Але, калі прызначаецца гарманальны гель, значыць, ёсць парушэнні з гармонамі. Можа, на гэтым варта засяродзіцца? Прывяду прыклад. У беларусаў «любімы стан» — гіпатэрыёз ці, прасцей кажучы, недахоп гармонаў шчытападобнай залозы. Такая асаблівасць мясцовасці, мала ёду, балоцістыя глебы і гэтак далей. І ў жаночым арганізме вельмі шмат такіх нюансаў.

**— Канстанцін Аляксеевіч, ну вось уявім, што жанчына знайшла ў грудзях нейкае ўтварэнне. Калі ёй варта пачынаць панікаваць?**

— Калі жанчына пры самаабследаванні малочных залоз (якое яна павінна, па ідэі, праводзіць раз на месяц) знайшла нейкае ўтварэнне, першы крок — ісці да гінеколага. Ён правядзе абследаванне, пры неабходнасці прызначыць кансультацыю ў анколага. Многіх пужаюць выдзяленні з соскаў. Яны сапраўды могуць сведчыць аб перадракавым стане, але бываюць і бяскрыўднымі. Грудзі могуць рэагаваць на гарманальныя збоі мінімальнымі выдзяленнямі, зусім маленькімі светлымі крапелькамі. Але калі выдзяленні чырвоныя, іх нямала, то варта сур'ёзна да іх паставіцца.

**— Калі ў родзе былі выпадкі раку малочных залоз, уладальніцам фібраадэном варта перажываць на гэты конт?**

— Спадчынная схільнасць да раку малочных залоз сапраўды ёсць, і яна залежыць ад генаў BRCA1 і BRCA2. У РНПЦ анкалогіі можна здаць аналіз і ўпэўніцца, ёсць гэтыя гены ці не. Але паўтаруся: фібраадэнома не перарастае ў рак, і наяўнасць гена BRCA на яе ніяк не ўплывае. Рак і фібраадэнома — гэта зусім розныя рэчы.

**— Калі мы сустракаліся з вамі падчас аперацыі, вы сказалі, што рак, як і актуальны цяпер каранавірус, трэба паважаць. Што вы мелі на ўвазе?**

— Да гэтых захворванняў трэба ставіцца вельмі сур'ёзна, бо яны вядуць да лятальнага зыходу. Рак не шкадуе нікога: ні маладых, ні старых. І яму абсалютна ўсё роўна, якія ў вас грошы, сувязі і статус. Усім вядомы прыклад: заснавальнік кампаніі Apple Стыў Джобс памёр ад раку падстраўнікавай залозы. Гэта быў чалавек, у якога было ўсё, і ўсё скончылася.

**— Вернемся да галоўнай тэмы нашай размовы. Ад раку малочнай залозы часта паміраюць?**

— На жаль, так. Чаму яшчэ трэба паважаць рак? Таму што гэта хранічнае захворванне. Калі ў чалавека першая стадыя раку малочнай залозы, яго прааперыравалі, пяць гадоў ён прапіў гармоны, і, здаецца, усё добра. Але гэта не значыць, што так будзе заўсёды. Яму трэба пастаянна назірацца. Даказана, што рак малочнай залозы робіць дэпо клетак у косным мозгу. І калі гэтыя клеткі «прачнуцца», не ведае ніхто. Могуць праз некалькі гадоў, а многія банальна з прычыны ўзросту не дажываюць да другога праяўлення.

**— Канстанцін Аляксеевіч, на ваш погляд як анколага, чалавецтва зможа калісьці перамагчы рак?**

— Павінны ж людзі ад нечага паміраць. Рак — гэта натуральная прычына смерці чалавека. Іншае пытанне — у 50 ці ў 150 гадоў? Арганізм старэе, у клетках назапашваюцца генетычныя памылкі, што з часам прыводзіць да злаякаснай пухліны. Рак будзе заўсёды — праблема ў тым, што яго не павінна быць у маладых. І варта адзначыць, што сёння распрацоўваюцца вакцыны ад некаторых форм злаякасных пухлін, распрацоўваюцца новыя метады барацьбы з ракам. Кожны год з'яўляюцца новыя віды тэрапіі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703 |
| Продавец | ОАО «БЕЛМЕТАЛЛ», г. Минск, пр-т Партизанский, 174 |

**Предмет аукциона (одним лотом) –**
**ЗДАНИЯ И СООРУЖЕНИЯ АВТОРЫНКА**
**Месторасположение – Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 18**

| Наименование | Общая пл., кв. м | Инвентарный номер | Назначение | Адрес (№ дома) |
|---|---|---|---|---|
| Открытый склад № 1 | 8916,3 | 110/С-62149 | Здание специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ | 18В |
| Составные части и принадлежности: одно бетонное, одно плиточное покрытие, один железнодорожный подъездной путь, забор, двое ворот | | | | |
| Торговые павильоны | 345,8 | 110/С-100114 | Здание специализированное розничной торговли | 18В/4 |
| Магазин автозапчастей | 98,8 | 110/С-86092 | Здание специализированное розничной торговли | 18В/1 |
| Составные части и принадлежности: металлическая пристройка | | | | |
| Туалет | 28,6 | 110/С-99800 | Сооружение неустановленного назначения | 18В/2 |
| Пост охраны | 7,7 | 110/С-99750 | Сооружение неустановленного назначения | 18В/3 |

**Имущество, входящее в состав лота:** кран мостовой (инв. № 4155), передвижной киоск (инв. № 1000020), передвижной киоск (инв. № 1000021), передвижной киоск (инв. № 1000022), эстакада (инв. № 0000119), заезд на эстакаду (инв. № 0000146), рекламный щит № 2 «Авторынок Звездный» (инв. № 0000114)

***Сведения о земельных участках***: пл. **2,4570** га и **0,0137** га предоставлены продавцу для обслуживания зданий и сооружений авторынка на праве постоянного пользования

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 682 344,00 бел. руб.**

***Обременения***: здания с инв. № 110/С-86092 и № 110/С-100114 находятся в залоге у банка

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **20** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **26.10.2021 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **25.10.2021 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (44) 704-92-06, www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА
# ТОАО «ГРОДНО КУЛЬТТОРГ»

| | **Лот № 1** |
|---|---|
| Предмет торгов, краткая характеристика | **Капитальное строение, инв. № 400/С-30916** (здание для складирования обуви № 2–3) общей площадью 1570,2 кв. м, кирпичное, 1953 г. п., составные части и принадлежности: гараж, три склада, рампа, сарай; **капитальное строение, инв. № 400/С-102939** (уборная) общей площадью 9,8 кв. м, кирпичное, 1999 г. п.; **капитальное строение инв. № 400/С-161061** (благоустройство) общей площадью 608,8 кв. м, **капитальное строение, инв. № 400/С-161057** (ограждение территории) протяженностью 122,1 м, **пожарно-охранная сигнализация и запорная пожарная арматура** (в здании для складирования обуви № 2–3, инв. № 400/С-30916) |
| Информация о земельном участке | Кадастровый номер 440100000001012001, площадь – 0,4192 га, назначение – для обслуживания здания складирования обуви № 2–3 и уборной, право аренды по 06.10.2070 года, в соответствии с генеральным планом г. Гродно земельный участок расположен на территории, предусмотренной под коммунально-обслуживающую и коммунально-складскую зоны. Возможно использование новыми собственниками строений для размещения административно-производственных, коммунально-складских и коммунально-обслуживающих объектов, объектов сопутствующего обслуживания |
| **Местонахождение имущества: Гродненская обл., г. Гродно, ул. Соколовского, 20К** | |
| **Обременения** | Часть площадей сдается в аренду: инв. № 400/С-30916 (108,4 кв. м – по 24.09.2023 г., 217,7 кв. м – по 30.11.2022 г., 25,74 кв. м – по 03.12.2021 г.; инв. № 400/С-161061 (40,0 кв. м – по 24.09.2022 г.) |
| **Начальная цена с учетом НДС: 644 436,80 руб.** | Задаток (1 %) – 6 444,00 руб. |

**Сведения о продавце:** ТОАО «Гродно Культторг», г. Гродно, ул. Пушкина, 37А, тел. 8 (0152) 568291

**Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка:** Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 621632, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X, УНП 500481906

Срок заключения договора купли-продажи: в течение 15 дней с момента проведения аукциона. Оплата в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи

**Торги состоятся 25 октября 2021 года в 12.30 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8**

| | |
|---|---|
| **Срок подачи документов** | **По 19 октября 2021 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8** |

**Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте www.fincentr.by Тел. для справок 8 (0152) 621632.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ № 1: капитальное строение с инвентарным номерам 401/С-11729, расположенного по адресу: Гродненская область, Гродненский район, ул. Карла Маркса, д. 1, площадь – 14,2 кв. м, назначение – одноэтажное кирпичное здание проходной, наименование – одноэтажное кирпичное здание проходной.
Лот № 1 расположен на земельном участке, 422050400002001886, расположенного по адресу: Гродненская область, Гродненский район, г. Скидель, ул. Карла Маркса, д. 1 площадь – 0,0393 га, назначение – земельный участок для эксплуатаций и обслуживания складов.
Начальная цена продажи лота – 5 000 руб. (пять тысяч рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 1 000 руб. (одна тысяча рублей)

ЛОТ № 2: капитальное строение с инвентарным номером 401/С-32188, расположенного по адресу: Гродненская область, Гродненский район, г. Скидель, ул. Ленина, 5/1, площадь – 29,0 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад и капитальное строение с инвентарным номерам 401/D-8010, расположенного по адресу: Гродненская область, Гродненский район, г. Скидель, ул. Ленина, 5-2, площадь – 518,1 кв. м, назначение – производственное помещение, наименование – колбасный цех.
Лот № 2 расположен на земельном участке, 422050400020000459, расположенного по адресу: Гродненская область, Гродненский район, г. Скидель, ул. Карла Маркса, д.1 площадь – 0,1503 га, назначение – земельный участок для эксплуатаций и обслуживания складов.
Начальная цена продажи лота – 54 000 руб. (пятьдесят четыре тысячи рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 5 400 руб. (пять тысяч четыреста рублей)

Продавец – Щучинский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231513, г. Щучин, ул. Пушкина, 26, тел. (801514) 28-1-50

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 55-87-70, 55-87-71

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB3012050083 3225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 25 октября 2021 г. в 10.00 по адресу: Гродненская область, г. Щучин, ул. Пушкина, 26**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 21 октября 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/aukcion**

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Хойникский КБО»** (УНП 400056519) 247622, Гомельская область, г. Хойники, ул. К. Маркса, 28, тел. +375 232 31-59-72, +375 29 135-78-72.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **05 октября 2021 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение, инв. № 343/С-94164, площадь – 1266,0 кв. м, назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – здание Дома быта. Составные части и принадлежности: подвал. Кадастровый номер земельного участка, на котором расположено капитальное строение – 325450100001016097. Местонахождение: Гомельская обл., г. Хойники, ул. Карла Маркса, 27 | 136 500,00 |
| 2 | Пресс дублирующий Comel PLT-1100, 2013 г. в., инв. № 4262 | 400,00 |
| 3 | Ламинатор Ibico PouchMaster PQ. 2013 г. в., инв. № 7092 | 30,00 |
| 4 | Деревообрабатывающие станки: 1. Рейсмусовый станок односторонний, модель СР-3, 2007 г. в., инв. № 4213. 2. Станок торцовочный круглопильный, модель Ц6-2И1, 2012 г. в., инв. № 5015 | 1 750,00 |
| 5 | Оборудование для шиномонтажа: 1. Гидравлический подъемник для легковых автомобилей, модель ПР-3, 2007 г. в., инв. № 4235. 2. Шиномонтажный станок «SEMIAUTOMATIC», модель С601, 2007 г. в., инв. № 4210. 3. Машина балансировочная, модель ЛС1-01, 2007 г. в., инв. № 4211 | 1 450,00 |

**Местонахождение предметов торгов:** п. 2–3 г. Гомель, ул. Катунина, 4; п. 5–9 Гомель, ул. Б. Хмельницкого, 77.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 09.00 25.09.2021 г. по 17.00 04.10.2021 г.: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» 09.09.2021 г.

В извещении **РУП «Торговый дом «Восточный»**, опубликованном в газете «Звязда» от 17.09.2021 № 179 (29548), о проведении открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, проводимого 21.10.2021, адрес расположения лота № 10 **читать в следующей редакции: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, 17В.**

УНП 101127633

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н. С. извещает о проведении 25 октября 2021 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (Лоты №№ 1–56) опубликован в газете «Звязда» от 24.09.2021 г.
Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».
Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19

**Продавец:** открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», ул. Школьная, 8, 247210, г. Жлобин, Гомельская область. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (029) 303-53-09, Григорович Павел Карлович.** **Шаг аукционных торгов – 5** (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**.

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 24 сентября 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 21 октября 2021 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденное постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19.**

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Буда-Кошелевский КБО»** (УНН 400035136), 247355, Гомельская обл., г. Буда-Кошелева, ул. Головачева, 10, тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **05 октября 2021 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Комплект мебели (комплект для организации рабочего места приемщика, инв. № 550, 2010 г. в. Рабочее место приемщика, инв. № 501, 2009 г. в. ) | 47,00 |
| 2 | Комплект оборудования по ремонту швейных изделий, инв. № 555, 2008 г. в. | 17,00 |
| 3 | Петельная машина 25 кл Minerva 19724, инв. № 00018, 1989 г. в. | 11,00 |
| 4 | Профессиональный гладильный каток Electrolux IC43316 , инв. № 997032, 2007 г. в. | 122,00 |
| 5 | Сушуар, инв. № 509, 2008 г. в. | 1,70 |
| 6 | Комплект оборудования для организации рабочего места по оказанию парикмахерских услуг, инв. № б/н, 2011 г. в. | 20,00 |
| 7 | Комплект оборудования для организации рабочего места приемщика, инв. № б/н, 2011 г. в. | 26,00 |
| 8 | Комплект оборудования для организации рабочего места по ремонту швейных изделий, инв. № б/н, 2011 г. в. | 10,00 |
| 9 | Сушуар, инв. № 851, 2008 г. в. | 1,90 |
| 10 | Комплект оборудования рабочего места обувщика, инв. № б/н, 2008 г. в. | 31,00 |

Местонахождение: п. 1–3 – г. Буда-Кошелево, ул. Головачева, 10; п. 4–5 – г. Гомель, ул. Б. Хмельницкого, 77; п. 6–10 – г. Буда-Кошелево, ул. 50 лет Октября, 28.

Телефон для ознакомления и осмотра тел. +375 29 135-78-72.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 25.09.2021 г. 09.00 по 04.10.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 24.06.2021 г.




## УСЁ СВАЁ НАСІ З САБОЙ,

### альбо Страціць, каб... знайсці

...Як той казаў, чорт сем пар лапцяў стаптаў, пакуль гэту пару сабраў. Муж, Мікола, быў дбайным гаспадаром, шчодрым чалавекам і пчаляром, якіх пашукаць, а вось жонка яго, Дуся, і з маладосці добрай жміндай лічылася, а пад старасць дык зусім звар'яцела. Родны сын сабе дом будаваў — ні рубля не пазычыла: схлусіла, што няма. Справа ледзь да разводу тады не дайшла... Дзеці ўмяшаліся: упрасілі бацьку, каб дараваў, каб не шукаў больш матулін тайнік. Нехай сама, можа, скажа... А не — дык халера з ім: хай большай бяды не будзе!

Мікола з гэтым згадзіўся, хоць і крыўдаваў.

...У той дзень ён у садзе поркаўся, апалае лісце зграбаў. Дуся ў госці збіралася — у адведкі да пляменніцы. Яна з тыдзень як з радзільні вярнулася, а ў вёсцы за правіла было хадзіць да парадзіх з падарункамі. Прыносілі хто што мог: грошы, гасцінцы — усё, апроч спіртнога. Ім сама парадзіха магла частаваць. А магла і абысціся, бо мужчыны ў адведкі ніколі не хадзілі, а сярод жанчын выпівох не было. Яны, сабраўшыся разам, і без таго няблага сядзелі — размаўлялі, спявалі...

Вось і цяпер з садка Мікола бачыў, як у хату да іх па Дусю зайшла прыбраная сваячка.

Пакіраваў за ёю і сам: хацеў перакінуцца словам ды перадаць парадзісе слоічак мёду.

Дуся без ахвоты (бо па ёй мёд лепш бы прадаць), але ўзяла яго, паставіла ў сумку, дастала з шафы парадныя чаравікі...

— Ну ты і прыбралася! — засмяяўся муж. — Кофта новая, хустка новая, а спадніца старая. Ты ў ёй нават сабакам збрыдзела — другую пяцігодку носіш... Можна падумаць, што лепшай няма... Скінь! Не ў грады ж ідзеш.

Дуся завагалася: спачатку памацала-пашукала, як тая спадніца расшпільваецца, потым — куды б яе палажыць... Павесіла на кручок і чамусьці пад ватнік, потым панесла ў кладоўку. «З чаго б гэта столькі мітусні?» — падумаў Мікола і, як толькі жанчыны з двара, падаўся ў кладоўку. Узяў там адзежыну, паглядзеў: спадніца як спадніца — у складкі, аблезлая... Хацеў пакласці дзе ўзяў, але ж тут вокам зачапіўся за падол: у ліштве ён неяк тапырыўся.

Прыйшлося памацаць, з чаго б гэта, і адчуць, што нешта ж там шапаціць: як быццам папера?

Узяў нажніцы, падпароў трохі нітак і аслупянеў: там па ўсёй ліштве былі зашытыя грошы, купюры — па пяцьдзясят савецкіх рублёў, па сто... «Гэта ж дадумацца!» — не верыў вачам Мікола. А далей...

Дастаў ён усё да апошняй паперкі, злічыў, знайшоў для грошай новую хованку і рушыў у сад. Падпаліў там апалае лісце, на край вогнішча паклаў спадніцу, каб згарэў падол. А тое, што засталося (пядзя-другая да паясніцы), кінуў пад плот каля ганка.

Факт, што Дуся, вярнуўшыся з адведак, адзежыну сваю тут жа згледзела і як не самлела:

— Асталоп! Прыдурак! Ты нашто маю спадніцу спаліў? — на ўсю вёску загаласіла яна.

— Ды халера з ёй, са спадніцай! — паспрабаваў адбіцца Мікола. — Тут магла быць большая бяда: лісцё было ўгарэлася. Агонь аж на хату пайшоў. Я давай тушыць... Вось спадніца твая і падкруцілася... Халера з ёй! Старая ж была. Не шкадуй! Мы табе сем новых купім і...

Шмат чаго яшчэ абяцаў Мікола сваёй палавіне. І нават купіў — за драбнейшыя грошы. Буйнейшыя дзецям аддаў. Тыя ў хуткім часе па машыне купілі.

Карацей — і ў іх было радасці шмат, і ў бацькі...

Маці мо таксама здагадалася, за якія такія грошы. Але прызнацца, што гадамі хавала іх, так і не змагла.

**Ніна Кандрашонак,**
*г. Петрыкаў.*

## ДЗЕ ШУКАЦЬ СЯКЕРУ,

### альбо Усё геніяльнае проста

...Не так даўно, у сярэдзіне верасня, аб'явіўся наш Іван Іванавіч, нагадаў, што зіма на парозе — самы час пад'ехаць на лецішча, праверыць газавы кацёл.

Іван Іванавіч робіць гэта кожную восень і ўжо даўно... Хоць пачатак нашай супрацы ледзьве не стаў канцом. Зрэшты, усё па парадку.

У той год мой муж, што называецца, уступіў у спадчыну — стаў уладальнікам вясковай хаты. Мы, жывучы і працуючы ў горадзе, вырашылі пакінуць яе, абсталяваць пад дачу. За лета правялі туды газ, за зіму планавалі зрабіць капітальны рамонт. Знаёмыя нават спецыяліста параілі. Маўляў, і малады, і ўмелы, і бярэ няшмат, і ўвесь дзень працуе...

А ў нас на «аб'екце» гэты рамонтнік, як выглядала, згаджаўся яшчэ і ад ночы нешта ўрваць, бо яно і сапраўды: які там восенню дзень? Плюс час на дарогу... «Справа пойдзе хутчэй, — пераконваў майстар, — калі тут буду жыць».

«А чаму б і не? — разважылі мы. — Хата, можна сказаць, жылая, ацяпленне працуе. Да таго ж Іван Іванавіч, майстар па абслугоўванні катла, параіў нам тэрмастат паставіць, каб паменшыць расходы газу...»

Карацей, пачыналася ўсё як належыць: Андрэй працаваў і наглядаў за домам, тэрмастат эканоміў грошы — значыць, воз крануўся... Праўда, ад'ехаў зусім няшмат, бо неяк з самай раніцы Андрэй пазваніў, каб паведаміць, што ў хаце холадна (на двары — каля нуля), што тэрмастат той валяецца на падлозе, а кацёл праз кожную хвіліну ўключаецца і тут жа выключаецца.

Як магла, я супакоіла маладога майстра і па тэлефоне ўсё расказала старому — Івану Іванавічу.

— Ды не хвалюйцеся, усё будзе добра, — запэўніў ён. — Я зараз жа пад'еду да вас у вёску і тут жа пазваню.

Час ішоў надзвычай марудна, і я не вытрымала — набрала нумар Андрэя.

— Дзед тут, — патлумачыў хлопец. — Кацёл разабраў, паломку пакуль не знайшоў...

Гэта была першая трывожная навіна. Другая збянтэжыла яшчэ больш.

— Дзед нічога не зрабіў, — далажыў мне майстар, — і збіраецца ад'язджаць. Кажа, што кацёл не працуе, таму што няма зазямлення. Я хацеў даказаць яму, што прычына не ў тым: зрабіў часовае — кацёл усё роўна не ўключаецца...

Па маіх жаночых звілінах табуном панесліся думкі на тэму, што рабіць. Андрэй тым часам выдаў чужую — «выратавальную»:

— Дзед прапануе зліць ваду і чакаць вясны. Выходзіць, я застаюся без працы, а вы без рамонту?

Яшчэ раз, як толькі магла, я стала супакойваць сябе і майстра, хоць ён, падобна, адступаць не збіраўся: назаўтра ж далажыў, што зрабіў-такі нармальнае зазямленне.

Гэту навіну я тут жа данесла Івану Іванавічу, але цяпер з выездам на месца ён не паспяшаўся: сказаў, што іншых заказаў шмат... Да таго ж мы, маўляў, павінны стварыць яму ўмовы: паставіць тую ж пушку-абагравальнік, бо ў катле электроніка...

Я зноў пазваніла Андрэю... Андрэй — на раніцу мне, каб паведаміць, што знайшоў абагравальнік і ў кацельнай цёпла.

Такім чынам, Іван Іванавіч паехаў на аб'ект і там, на месцы («Ды прыдушыць яго мала!» — сказаў мне потым Андрэй на адрас дзеда), прымусіў... раскапаць траншэю, каб паглядзець зазямленне. З ім, як і варта было чакаць, быў поўны парадак, а вось з катлом... Чаму ён не працуе, Іван Іванавіч па-ранейшаму не ведаў... Разоў колькі ён паўтараў, што трэба зліваць ваду і чакаць вясны, парываўся ўсё кінуць і з'ехаць з «аб'екта». Але Андрэй яго проста не адпускаў: гразіўся нават, што замкне ў кацельнай...

А ў рэшце абодва майстры стаміліся сварыцца і пайшлі ў кухню, каб разам папіць гарбаты. Андрэй на правах гаспадара паставіў на пліту чайнік, уключыў канфорку — агню пад ёй не было.

...Трохі пазней спецыялісты прызналі, што ў нас зламаўся лічыльнік — спынілася падача газу. Так што справа была зусім не ў катле.

Іншымі словамі, усё геніяльнае проста: сякеру знайшлі пад лаўкай. І як жа шкада, што нашы майстры — і стары, і малады — спалілі столькі нерваў і сабе, і нам, бо зазірнуць туды проста не здагадаліся.

**Наталля Шастакова,**
*г. Гомель.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**АД ЯЕ Ж.**

*У першай з надрукаваных гісторый (пра грашовы ўклад у спадніцы) насцярожыла слова ліштва. Гэта ж, здаецца, нешта драўлянае, тое, чым упрыгожваюць вокны?*

*Слоўнік падказаў: не толькі. Бо ліштва — гэта яшчэ і плінтус, і металічная накладная пласцінка са шчылінай для ключа на дзвярах ды шуфлядах, і... модная цяпер падгорнутая або нашытая палоска для аддзелкі-падрубкі — мо на той жа спадніцы.*

*Так што спадарыні Кандрашонак асобны дзякуй за старое новае слова. А ўсім іншым чытачам — добрага здароўя, утульных і цёплых рэчаў і гэткіх жа вечароў — з разумнымі кнігамі і, магчыма, з газетай «Звязда», падпісацца на якую варта хоць бы для таго, каб не забыць сваю родную мову.*

Неасабісты суб'ектыў



# НА ЦЁПЛЫ ЎСПАМІН,

## або Рэцэпт бісквіту як паратунак ад холаду

Ад гэтага нечаканага ранняга холаду, які сёлета сапсаваў увесь верасень, вельмі цяжка знайсці паратунак. Здаецца, ніяк не саграцца — ні коўдра, ні абагравальнік, ні нават глінтвейн не дапамагаюць, холад пасяліўся недзе ўнутры, і ніяк яго з сябе не выгнаць. Хіба што... знайсці штосьці, што дапаможа не думаць, як холадна. Агорне спакоем, утульнасцю, адчуваннем зладжанасці ўласнага існавання з навакольным светам, у якім... ну так, здараецца часам і такі вось халодны верасень. Нездарма ж у нашай мове ёсць гэта кранальнае: «На цёплы ўспамін» (І гэта зусім не тое, што «На добрую памяць»). Мы гаворым, пішам або проста маем на ўвазе гэтыя словы менавіта аб такіх рэчах, якія здольныя сагрэць душу ў любую непагадзь. Збіраем іх самі, атрымліваем у падарунак, прывыкаем да іх, часам забываемся пра іх надоўга, каб пасля аднойчы раз — і нібы сонейка бліснула сярод суцэльных шэрых хмар.

ВОСЬ, напрыклад, соваешся па кватэры з кубкам гарачай гарбаты, абгарнуўшыся пледам, і раптам нібы іншымі вачыма глядзіш на пляскаты шэры каменьчык, што ляжыць на паліцы каля тэлевізара. Ляжыць сабе ды ляжыць, ты яго кожны дзень каторы год бачыш. А тут раптам бярэш яго ў рукі, гладзіш — і ты ўжо на пранізаным сонцам беразе Байкала, і халаднаватыя дзівосна празрыстыя хвалі ліжуць твае босыя ногі і тысячы такіх шэрых з залацістай іскрынкай каменьчыкаў, а вакол цёмныя скалы, парослыя калматымі хвоямі і адчуванне такой сілы, такой магутнасці, ад якой аж перапыняецца дыханне... Заўважаеш, што побач з гэтым каменьчыкам таксама не проста цацкі-дробязі. Ружовыя крышталі, падобныя формай на ружу (іх так і называюць — «ружа пустыні») — напамін аб казачным світанні на салёным возеры ў Тунісе, на ўскрайку Сахары. Летам яно перасыхае і ператвараецца ў ружовую пустыню. А з першымі промнямі сонца крышталі солі ператвараюцца ў бліскучыя каменьчыкі, і гэта бліскучае ружовае хараство распасціраецца да самай лініі неба. Памятаю, я ішла і ішла насустрач сонцу, і здавалася, што менавіта там, за даляглядам сустрэнеш Таго, хто кіруе ўсім на зямлі... А ў непрыкметным шэрым букеціку дагэтуль жыве водар лаванды і чабору, і гэты водар на некалькі імгненняў пераносіць у чароўны Праванс, дзе ўлетку цяплом дыхаюць нават замшэлыя сцены старажытных будынкаў...

АЛЕ ёсць у маім доме яшчэ лепшыя крыніцы цяпла — тыя, што нагадваюць пра сустрэчы са шчырымі людзьмі, якіх у гэтым жыцці (дзякуй прафесіі!) было нямала. Вось, напрыклад, звязаная шыдэлкам белая сурвэтка. Здавалася б, звычайная, такія нашы бабулі гадоў сорак таму вязалі стосамі. Але гэта — асаблівая. Мне яе падарылі падчас камандзіроўкі ў Лёзна — невялікім гарадку на ўсходзе Віцебшчыны. Адзін з самых цёплых успамінаў на ўсё жыццё: ранняя вясна, сонная рака са смешнай назвай Машна ў празрыстым тумане, вісячы драўляны мост над ёй... Сонечныя ўсмешкі людзей, пошукі дома, дзе нарадзіўся Марк Шагал, мясцовы танец матлёт, простыя рухі якога ў мяне ніяк не атрымліваліся, але было так весела і хораша...

А калі захочацца пачаставаць дамашніх чымсьці смачненькім, асабліва такой вось халоднай восенню, я пяку пірог, які называю «бісквіт Ніны Маркаўны». Яго рэцэпт даўно ведаю на памяць, але ўсё роўна кожны раз шукаю ў кулінарнай кнізе складзеную на чатыры часткі пажаўцелую паперчыну, дзе акуратным настаўніцкім почыркам напісана, што і ў якім парадку дадаваць у той ласунак. Почырк знаёмы: наша адданая чытачка Ніна Маркаўна Захарэвіч з Пастаў часта пісала ў рэдакцыю — прыпеўкі, вершы, развагі аб жыцці. У адным з лістоў яна даслала цікавую гісторыю пра народную мясцовую песню, заснаваную на рэальных падзеях, што адбываліся да вайны ў адным мястэчку. Гісторыя, трэба сказаць, вартая Шэкспіра: каханне, супраціў бацькоў і ўрэшце смерць абодвух закаханых... Памятаю, спякотным летнім днём мы з Нінай Маркаўнай і яе дачкой, маладой настаўніцай Людмілай, прадзіраліся праз кустоўе закінутай часткі могілак у Дунілавічах, каб знайсці магілу мясцовай Джульеты. І мы яе — пазначаную 1936 годам! — знайшлі-такі... А потым сядзелі ва ўтульнай кухні ў доме Ніны Маркаўны, пілі гарбату і елі надзвычай смачны пірог. Яго рэцэпт, напісаны ўласнаручна гаспадыняй, я прывезла з той камандзіроўкі разам з цікавым матэрыялам... Няма ўжо на свеце Ніны Маркаўны, а яе дачка Людміла Курыловіч стала вядомай мастачкай, якая малюе дзівосныя карціны, што нібы ззяюць знутры. Яна нярэдка публікуе свае новыя работы ў «Фэйсбуку» (мы там сябруем), і кожны раз здаецца, што бачыш святло яе роднага дома, дзе ва ўтульнай кухні мы ласаваліся смачным бісквітам Ніны Маркаўны...

ДОБРА, што ёсць у жыцці такія рэчы і такія ўспаміны. Цёплыя, што саграваюць нават у самую слотную восень... Замест таго, каб мерзнуць і клясці надвор'е, пашукайце іх у сваім доме, у сваёй памяці, у сваім сэрцы. Упэўнена: яны знойдуцца ў кожнага, нават у таго, хто не верыць, што холад і дождж — гэта не назаўжды.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# «Сельская гаспадарка — ГЭТЫМ ТРЭБА ЖЫЦЬ»



Дырэктар ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» Юрый КЛІМАШ.

Фота Алены ДАЎЖАНОК.

**Пагаварылі з дырэктарам паспяховай гаспадаркі аб шчасці**

**Агульная плошча гаспадаркі «Крутагор'е-Петкавічы» — 14 784 гектары. Гэта амаль 25 % Дзяржынскага раёна. Дойны статак — 3765 галоў, свінакомплекс з пагалоўем — больш за 23 тысячы, вытворчасць мясных паўфабрыкатаў і каўбасны цэх (больш за 120 відаў прадукцыі), бульбасховішча, малочнатаварныя комплексы (плюс цалкам рабатызаваная ферма сістэмы «Астранаўт») і кіламетры палёў — рапсу, збожжавых, кукурузы, бульбы... Уласная гандлёвая сетка, сталовая, швейны цэх, лазневы комплекс і цэх дапрацоўкі рапсу, сад, падсобныя вытворчасці — гранітны, камбікормавы, сталярны цэхі, піларама.**


Фота Алены ДАЎЖАНОК.
Камбайнер Уладзімір ПРАВАДА.

Дырэктар гаспадаркі жартуе, што засталося наладзіць толькі выпечку хлеба (гэта ў найбліжэйшых планах), і «Крутагор'е-Петкавічы» зможа жыць цалкам аўтаномна, на самазабеспячэнні. А галоўная каштоўнасць прадпрыемства — ні многа ні мала шчасце людзей, якія тут працуюць.



Фота Алены ДАЎЖАНОК.
Машына для выязнога гандлю. «Нашу мясную прадукцыю ахвотна купляюць і на «МАЗе», і на «Амкадоры», — распавядае намесніца дырэктара па ідэалагічнай рабоце ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» Кацярына АПРАНІЧ.

## АБ РАДАСЦІ ПРАЦЫ

— Мая мара... не, не мара, а хутчэй мэта — стварыць прадпрыемства, дзе людзям было б проста добра. Дзе працавалі б шчаслівыя людзі, — кажа **дырэктар ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» Юрый КЛІМАШ.** — Няшчасны чалавек не можа плённа працаваць.



Калектыў ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» складае сёння больш за 700 супрацоўнікаў.

— Калі ўлічыць, што ў кожнага ёсць сем'і, то кіраўніцтва прадпрыемства ў адказе за дзве–дзве з паловай тысячы чалавек, — адзначае Юрый Пятровіч.

— А наколькі шчасце супрацоўнікаў залежыць ад кіраўніка?

— Скажу адно: чалавек павінен ісці на працу з радасцю і жаданнем ствараць, а з працы — з пачуццём фінансавага і маральнага задавальнення, несці дадому радасць і пазітыў. Пачуццё задавальнення і радасці з раніцы павінны стварыць мы — я як кіраўнік і мая каманда, а бытавы камфорт і ўтульнасць яму павінны стварыць дома. Але і гэта шмат у чым залежыць ад таго, што ён прынясе дадому з працы. Гэта значыць — ад яго зарплаты.

На пытанне аб сярэдняй зарплаце па прадпрыемстве Юрый Пятровіч паціскае плячыма:

— На мой погляд, паняцця «сярэдняя зарплата» быць не павінна — кожны зарабляе столькі, колькі гатовы ўкладваць сіл. У нас практыкуецца іншае паняцце — мінімальны заробак. У краіне ёсць пражытковы мінімум, мы павялічваем яго ўдвая, і калі чалавек па нейкіх прычынах у гэтым месяцы не здолеў зарабіць больш, ён можа быць упэўнены, што два пражытковыя мінімумы ён у любым выпадку атрымае. Плюс стыпендыю дзецям.

Месяц на месяц не прыходзіцца, але наогул механізатары, даяркі, спецыялісты атрымліваюць тут і дзве, і тры тысячы беларускіх рублёў, кажа дырэктар.

Пра стыпендыю трэба сказаць асобна. Усім дзецям супрацоўнікаў гаспадаркі, незалежна ад таго, вучацца яны ў мясцовай школе або ў школах навакольных гарадоў, з трэцяга да адзінаццатага класа гаспадарка выплачвае стыпендыю. З 3 да 10 класа яна складае адну базавую велічыню, у старэйшай школе — дзве базавыя. У кожнага дзіцяці ёсць свая банкаўская картка, але да 10 класа яна прывязаная да карты бацькоў, а калі дзеці становяцца старэйшымі, могуць распараджацца грашыма ўжо самастойна. Але стыпендыя налічваецца толькі пры ўмове добрай паспяховасці: калі сярэдні бал не ніжэйшы за 7 у малодшай і сярэдняй школе і не ніжэйшы за 7,5 у старэйшай школе (паспяховасць кожную чвэрць пацвярджаецца даведкамі).

— Многія нашы дзеці вучацца ў мінскіх школах. І калі першы раз бацькі бяруць даведку аб паспяховасці дзяцей, у сталічных школах напачатку проста не вераць, што гаспадарка выплачвае стыпендыю школьнікам, — распавялі на прадпрыемстве.

Заснавала гаспадарка стыпендыю і «сваім» студэнтам сельскагаспадарчых ВНУ.

— Сістэма стыпендый працуе ўжо другі год. І паспяховасць заўважна павысілася, — кажа Юрый Пятровіч. — Гэта адзін са спосабаў стымулявання работнікаў праз іх дзяцей. Але галоўная задача тут — прывіць дзецям разуменне таго, наколькі важна працаваць, усведамленне, што менавіта праца — ключ да дабрабыту і поспеху ў жыцці.

## АБ РАЗРЫВЕ ШАБЛОНУ

На візітцы дырэктара ААТ «Крутагор'е-Петкавічы», дзе звычайна пішацца пасада, чытаем: «Проста добры чалавек». Дзяўчыны тут ходзяць на высокіх абцасах, а сама «кантора» больш нагадвае філіял банка або сучасны офіс: турнікет, люстэркі, стыльны рамонт. Каля ўвахода ў кабінет дырэктара — шыльдачка: «Калі ў цябе праблема, заходзячы да дырэктара, прапануй як мінімум два варыянты яе вырашэння. Не можаш, тады не рабі з гэтага праблему». Словам, сапраўдны разрыў шаблону. Трапляючы сюды, раптам пачынаеш прыкідваць: а ці не застацца тут працаваць?..

Недахопу ў кадрах, зразумела, гаспадарка не адчувае. Больш за тое, можа дазволіць сабе прыдзірліва выбіраць. Уладкоўвацца сюды спрабуюць спецыялісты не толькі з усёй Беларусі, але і з многіх краін СНД.

— Мы загадзя ствараем базу даных, стараемся збіраць найлепшых. Бяром на працу шмат моладзі. Сёння на любой вытворчасці ўсё вельмі хутка змяняецца. Размова нават не пра тэхналогіі, а пра падыходы да вытворчасці і жыцця. У сорак гадоў чалавека перавучваць ужо позна — прасцей узяць маладога спецыяліста і паспрабаваць настроіць на наш рытм. А рытм у нас вельмі складаны, мы практыкуем нестандартныя падыходы да работы. Нагрузка, якую нясуць нашы спецыялісты, у разы вышэйшая, чым на многіх іншых прадпрыемствах галіны. Нам важна, каб адзін супрацоўнік мог сумяшчаць функцыі некалькіх высакакласных спецыялістаў.

Сучасныя тэхналогіі змяняюць сельскую гаспадарку, дазваляючы ў рэжыме рэальнага часу адсочваць і дыягнаставаць стан глебы, культур, жывёлы і сельскагаспадарчых машын. Аўтаматызацыя дае магчымасць кантраляваць ураджай і атрымліваць гарантаваны вынік, нягледзячы на капрызы надвор'я. Ужо некалькі гадоў на палях ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» працуюць па найноўшай сістэме кропкавага земляробства. Замест таго, каб уносіць угнаенні, сродкі ахловы раслін, прэпараты хімпраполкі і насенне «на вока», як гэта рабілася на працягу ўсёй гісторыі сельскай гаспадаркі, сёння з дапамогай камп'ютарных тэхналогій можна дакладна разлічыць колькасць тых ці іншых рэсурсаў для кожнага ўчастка поля — з дакладнасцю да сантыметраў і грамаў.

— Электронную карту палёў мы ўжо склалі. Завяршылі аналіз глеб. На кожны элементарны ўчастак поля ўносіцца свая неабходная доза ўгнаенняў або насення, у залежнасці ад асаблівасцяў глебы і таго ўраджаю, які мы хочам атрымаць, — тлумачыць дырэктар. — Гэта дазваляе палепшыць кантроль, якасць і павялічыць аб'ёмы, палягчае работу аграномічнай і інжынернай службаў і ў канчатковым выніку гарантуе запланаваны ўраджай. Але для гэтага неабходна вельмі сучасная тэхніка.


Фота Алены ДАЎЖАНОК.
Уборка кармавых культур. Трактарыст-машыніст Віталь КРАЎЧУК і кіроўца Ігар ВЫСОЦКІ.

У прыватнасці, на самых адказных работах у гаспадарцы задзейнічана тэхніка з камп'ютарным кіраваннем, дзе механізатар не кіруе машынай, а выконвае ў большай ступені функцыю кантролю. Тэхніка ж і сее, і косіць, і выбраляе перадпасяўную апрацоўку без удзелу чалавека. Заданне на манітор трактара аграномічная служба скідвае дыстанцыйна, тлумачыць Юрый Клімаш.


Фота Аляксандры АНЦЭЛЕВІЧ.

# гэта не проста работа.



Фота Аляксандры АНЦЭЛЕВІЧ.



Уборка бульбы. Трактарыст-машыніст Станіслаў СУШКЕВІЧ, трактарыст-машыніст Дзмітрый ЧАРНЕЦ, слесар Сяргей РАГУЛЁЎ.

Фота Алены ДАЎЖАНОК.

**Ужо некалькі гадоў на палях ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» працуюць па найноўшай сістэме кропкавага земляробства.**

— Вынікамі па рапсе сёлета мы вельмі задаволеныя. Прырост — 600 тон да вала мінулага года. Па збожжы ў гэтым годзе ў параўнанні з мінулым ураджай ніжэйшы паўсюдна. Але ў нас па Дзяржынскім раёне самы маленькі недабор у працэнтах да ўраджаю мінулага года — 7 %. Мы атрымалі вал збожжа амаль 21 тысячу тон, ураджайнасць склала 45 цэнтнераў з гектара. Што датычыцца бульбы, пакуль убраная толькі пятая частка, але ўжо відавочна, што ўраджай ёсць. На бульбу ў гэтым годзе існуе попыт, і цана будзе высокай — гэта зразумела.

Штодня гаспадарка прадае 69 тон малака. Па выніках гэтага года плануецца прадаць 22 тысячы тон. 98 % малака, дарэчы, ОАО «Крутагор'е-Петкавічы» рэалізоўвае сортам «экстра».

— Надой з адной каровы за восем месяцаў гэтага года склаў 4691 літр, — расказвае **галоўны эканаміст гаспадаркі Таццяна ТАРАНТУХІНА.** — На свінакомплексе валавы прывес склаў 2799 тон, за восем месяцаў рэалізавана 2914 тон мяса.

Мясаперапрацоўчы цэх прадпрыемства выпускае каля 150 відаў мясных, каўбасных вырабаў, паўфабрыкатаў. Рэалізоўвае іх гаспадарка праз уласную гандлёвую сетку (шэсць стацыянарных і дзве перасоўных крамы), а таксама праз гандлёвыя прадпрыемствы Мінска, Дзяржынска, Слуцка, Салігорска.

— Мы прынцыпова перапрацоўваем толькі вырашчанае ў сябе астуджанае мяса — і ніякіх дабавак, — падкрэслівае дырэктар.

Так што шукайце на прылаўках каўбаску ад ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» — застанецеся задаволеныя!

У найбліжэйшых планах прадпрыемства — пашырэнне лінейкі ўласнай прадукцыі: закуплена абсталяванне для вытворчасці тушонкі.

## АБ РАБОЦЕ І ПРЫЗВАННІ

Нядаўна да ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» была далучана такая ж буйная па плошчы гаспадарка — філіял Мінскага мясакамбіната ААТ «Данілавічы». У ліку іншага прадпрыемству дастаўся буйны рагаты скот пароды «Лімузін», і ў планах калектыву ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» — запуск уласнай лінейкі мармуровага мяса.

— Вытворчасць такога мяса патрабуе досыць складанага дагляду жывёлы, асаблівай канструкцыі будынка, дзе ўтрымліваецца статак, карпатлівай і адказнай працы, — адзначае дырэктар. — Цяпер мы завяршаем будаўніцтва спецыялізаванага кароўніка, «дашліфоўваем» тэхналогію і працуем над лагістыкай. У далейшым мармуровае мяса будзе прадавацца ў нашых фірменных крамах і пастаўляцца ў рэстараны.

На тэрыторыі ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» наогул пастаянна ідзе будаўніцтва: узводзіцца жыллё для маладых сем'яў, рэмантуюцца мехдвары і малочнатаварныя комплексы, праводзіцца рэканструкцыя будынкаў.

— Збіраеш каманду спецыялістаў, ставіш высокую планку, разбіваеш мэту на асобныя задачы і выконваеш кожную ў дакладны тэрмін, — тлумачыць «тэхналогію поспеху» Юрый Пятровіч. — А наогул, спецыфіка працы ў сельскай гаспадарцы такая, што панацэя «работа» тут не зусім падыходзіць. Калі для вас гэта проста «работа», вам не трэба ісці працаваць на сяло. На сельгаспрадпрыемстве трэба не «працаваць» — гэтым трэба жыць. Жонкі і мужы нашых супрацоўнікаў і супрацоўніц часам не бачаць іх па некалькі дзён — яны зацемна сыходзяць і прыходзяць: бывае, працоўны дзень у нас зацягваецца далёка за звычайныя восем гадзін. А калі ў нас працуюць і муж, і жонка, а ў іх — маленькія дзеці, — ім наогул трэба помнік пры жыцці ставіць! Сельская гаспадарка — гэта прызванне, лад жыцця. Толькі так дасягаецца вынік.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

УНП 600112675



Фота Аляксандры АНЦЭЛЕВІЧ.

Прадавец чацвёртага разраду Ксенія СМІРНОВА.


# ДА СУСВЕТНАГА ДНЯ ТУРЫЗМУ і 20-ГОДДЗЯ Нацыянальнага агенцтва па турызме



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**28 верасня ў 11.00 адбудзецца адкрыццё і пленарнае пасяджэнне Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Перспектывы развіцця турызму ў сучасных умовах: сусветныя тэндэнцыі і рэгіянальныя кантэксты»,** арганізаванай Дэпартаментам па турызме Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным агенцтвам па турызме сумесна з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

Удзельнікі канферэнцыі з ліку прадстаўнікоў арганізацый турызму, устаноў культуры, адукацыі і навукі, грамадскіх арганізацый, аспірантаў і студэнтаў профільных спецыяльнасцяў вышэйшых навучальных устаноў і іншыя абмяркуюць такія актуальныя праблемы, як патэнцыял гісторыка-культурнай спадчыны ў турыстычнай дзейнасці, асаблівасці развіцця ўнутранага і ўязнога турызму ва ўмовах пандэміі, магчымасці міжнароднага і трансгранічнага турызму, сучасныя тэхналогіі ў індустрыі турызму і гасціннасці, практыкі экскурсійнай работы, актуальныя пытанні адукацыйнага турызму, праблемы і перспектывы інклюзіўнага турызму, спецыфіка развіцця аграэкатурызму ў Беларусі, альтэрнатыўныя віды турызму, краязнаўчыя даследаванні і турысцка-краязнаўчая дзейнасць.

**У гэты ж дзень у 18.00 пройдзе цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў Рэспубліканскага конкурсу сацыяльнай рэкламы «Пазнай Беларусь»,** які праводзіўся ў трох намінацыях — «Слоган», «Плакат», «Відэаролік». Мэта — папулярызацыя ўнутранага турызму з наступным прыцягненнем шырокіх слаёў насельніцтва да здзяйснення турыстычных падарожжаў па тэрыторыі Беларусі. Конкурс аб'яднаў больш за 600 удзельнікаў з усёй краіны.

Арганізатарам конкурсу выступіла Нацыянальнае агенцтва па турызме пры падтрымцы Міністэрства спорту і турызму, Міністэрства інфармацыі, Міністэрства культуры і Міністэрства адукацыі. Партнёры конкурсу — ААТ «АСБ Беларусбанк», ВА «Беларуснафта».

У рамках цырымоніі адбудзецца **ўшанаванне прадстаўнікоў сферы турызму з нагоды Сусветнага дня турызму.**

**Месца правядзення:**
**«Прэзідэнт Гатэль», г. Мінск, вул. Кірава, 18, зала «Алімп».**

Кантактныя тэлефоны:
+375 29 789-62-37, Ганна Мікалаеўна Вашчынчук, начальнік аддзела якасцяў і вучэбна-аналітычнай работы агенцтва — *у частцы канферэнцыі;*
+375 29 165-80-04, Кацярына Уладзіміраўна Шамарава, вядучы спецыяліст аддзела інфармацыйнага забеспячэння агенцтва — *у частцы цырымоніі ўзнагароджання лаўрэатаў конкурсу.*




УНП 190276566



## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества УП «Молодечноэлектромонтаж» ОАО «Будавник-169»

| Лот | Наименование лота | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона с учетом НДС 20 %, BYN |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Mitsubishu-Outlader, 2008 г. в., объем двигателя 2,4 л, коробка передач – автомат** | 16 920,00 | 1 692,00 | 846,00 |
| В отношении лота проводятся первые торги | | | | |
| **Дата и время проведения торгов** | **27 октября 2021 года в 14.00 (регистрация с 13.30 до 14.00)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, дом 1, офис 1127 | | | |
| **Прием заявлений** | Начало приема заявлений в 10.00 27.09.2021 г. Окончание приема заявлений в 16.00 26.10.2021 г. по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 | | | |
| **Местонахождение имущества** | Республика Беларусь, Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1а | | | |
| **Условия для участия в торгах** | 1. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте **https://orgtorg.by/info.**<br>2. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: Задаток для участия в торгах по лоту 1, принадлежащему УП «Молодечноэлектромонтаж» ОАО «Будавник-169», проводимых 27.10.2021. **Срок внесения задатка: с 27.09.2021 г. в 10.00 по 26.10.2021 г. в 16.00.**<br>3. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Контактное лицо по вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе – Анаида (+375 29 308 28 97).<br>4. Лица, желающие принять участие в аукционе, и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. Вознаграждение аукциониста составляет 7,5 % от конечной цены предмета торгов.<br>Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.<br>5. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.<br>6. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. По вопросу осмотра объектов обращаться к Андрею (+375445419099).<br>7. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.<br>8. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности | | | |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram: https://t.me/orgtorg** | | | |
| **Продавец** | **УП «Молодечноэлектромонтаж» ОАО «Будавник-169», г. Молодечно, ул. Космонавтов 8а, оф. 5) (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант», тел. +375293045990 (Дарья)** | | | |

# Філворд

Філворды, таксама вядомыя як венгерскія крыжаванкі, уяўляюць сабой галаваломкі, у якіх патрабуецца знайсці ўсе словы, упісаныя ў квадратную сетку. На першы погляд літары ўпісаны хаатычна, але на самай справе ўсе яны з'яўляюцца часткай слоў. Словы могуць выгінацца ў любы бок пад прамым вуглом, але не перасякаюцца адно з адным.

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Ь | Е | Л | А | В | Ы | Е | Р |
| Ц | Ц | А | В | І | Б | В | Г |
| А | В | А | П | Л | А | С | Л |
| Н | І | З | Р | А | А | Г | Ю |
| А | Ц | І | Ы | С | В | А | К |
| А | Н | Г | Г | М | Я | Т | В |
| Б | О | Г | Х | А | А | С | Ы |
| Ш | Ы | В | А | Н | К | П | А |

**ПЫТАННІ**

1. Дзюба драпежнай птушкі (5);
2. Імклівa бегчы, ратуючыся ад укусаў сляпнёў (8);
3. Бывалы чалавек (7);
4. Выдзеўбаная са ствала дрэва лодка з нашытымі для большай устойлівасці бартамі з досак (9);
5. Пярэдадзень свята (9);
6. Невялікі (часцей пясчаны) востраў (5);
7. Змазачнае масла (5);
8. Вялікі высокі будынак (4);
9. Адна дошчачка гонты (7);
10. Журавель каля калодзежа (5).

**АДКАЗЫ**

1. Глюга; 2. Гізавáць; 3. Бывалец; 4. Абшыванка; 5 Прысвятак; 6. Выспа; 7. Аліва; 8. Гмах; 9. Гонціна; 10. Асвер.

**Склаў Іван МАЗУРУК.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.59 | 19.03 | 12.04 |
| Віцебск — | 6.48 | 18.53 | 12.05 |
| Магілёў — | 6.49 | 18.53 | 12.04 |
| Гомель — | 6.45 | 18.50 | 12.05 |
| Гродна — | 7.14 | 19.18 | 12.04 |
| Брэст — | 7.15 | 19.19 | 12.04 |

### Месяц

*Поўня 21 верасня.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

### Імяніны

***Пр.** Фядоры, Віктара, Германа, Дзмітрыя, Мікалая, Сяргея.*
***К.** Марыны, Яніны, Герарда, Германа, Тодара.*



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

## ЗАЎТРА




Абітурыент-2022

# ВЫБІРАЕМ ПРАФЕСІЮ...

## 27 верасня стартуе другі Тыдзень прафесійнай адукацыі

За сем дзён яго арганізатары раскажуць школьнікам аб прафесійнай адукацыі, аб тым, як можа выглядаць любімае працоўнае месца, віртуальна праўдзіва па каледжаў і ліцэяў, прыадкрыюць сакрэт, як арганізоўваецца адукацыйны працэс і пазакласнае жыццё іх навучэнцаў, як у навучальных установах ствараецца інклюзіўнае адукацыйнае асяроддзе. 27 верасня адбудзецца афлайн-дыскусія на тэму «Эксклюзіў»? Inclusive!», дзе будуць абмяркоўвацца пытанні: што разумеюць пад інклюзіяй сёння? Якая яна — культура інклюзіўнасці? Як выбудоўваецца працэс навучання і працы для падлеткаў з асаблівасцямі развіцця?

Эксперты тыдня і цяперашнія навучэнцы не толькі раскажуць пра перавагі і нюансы навучання ў каледжах і ліцэях, але і дапамогуць вызначыцца, куды лепш паступаць, бо ў рамках тыдня асобны дзень будзе прысвечаны прафарыентацыі.

Далучыўшыся анлайн да Тыдня прафесійнай адукацыі, усе ахвотныя змогуць пабываць на віртуальных экскурсіях у каледжах і ліцэях, а таксама ўбачыць, як працуюць сучасныя прадпрыемствы Беларусі. Мінск, Гродна, Віцебск, Орша, Смілавічы — навучальныя ўстановы і прадпрыемствы ва ўсіх гэтых месцах можна будзе «наведаць» за тры дні. Усе відэа будуць апублікаваныя на YouTube-канале «Твая прафесійная адукацыя» (https://clck.ru/NZ789).

За праграмай тыдня можна сачыць на сайце http://profiweek.by. Мерапрыемства будзе карысным школьнікам, іх бацькам, настаўнікам, навучэнцам каледжаў і ліцэяў і прымеркавана да ўступнай кампаніі 2022 года. Яго мэта — дапамагчы ўжо цяпер будучым выпускнікам вызначыцца з прафесійнай сферай і навучальнай установай, дзе можна атрымаць неабходныя навыкі і кампетэнцыі.

З падрабязнай праграмай мерапрыемстваў можна азнаёміцца на сайце http://profiweek.by і ў сацыяльных сетках.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Даты | Падзеі | Людзі

### 24 ВЕРАСНЯ

У краіне

**1641** год — нарадзіўся (вёска Ятра, цяпер у Навагрудскім раёне) Станіслаў Незабітоўскі, беларускі мемуарыст. Вучыўся ў Навагрудскім езуіцкім калегіуме. Доўгі час жыў у Слуцку. Неаднаразова абіраўся дэпутатам ад навагрудскай шляхты на сесіі Трыбунала ВКЛ. Аўтар падрабязных успамінаў, дзе апісаны падзеі 1682—1700 гадоў на Навагрудчыне і Случчыне. Яго мемуары — каштоўная крыніца па гісторыі грамадска-палітычнага і прыватнага жыцця Беларусі і Літвы канца XVII стагоддзя.

**1932** год — у Мінску на базе газетнага аддзялення Камуністычнага ўніверсітэта Беларусі імя У. І. Леніна быў заснаваны Камуністычны інстытут журналістыкі імя С. М. Кірава. Рыхтаваў кадры для раённых, абласных і рэспубліканскіх газет. На вучобу прымаліся асобы са стажам работы не менш за тры гады і з 2-гадовым стажам кіруючай партыйнай ці грамадскай работы. Тэрмін навучання складаў тры гады. Пры КІЖы працавалі аднагадовая вячэрняя школа журналістаў камсамольска-маладзёжных газет і сектар завочнага навучання газетных кадраў. У 1941 годзе рэарганізаваны ў Беларускі інстытут журналістыкі.

**1956** год — нарадзіўся (г. п. Воранава) Сяргей Уладзіміравіч Абламейка, беларускі вучоны ў галіне інфарматыкі і кібернетыкі, акадэмік НАН Беларусі, доктар тэхнічных навук, прафесар. Аўтар больш за 450 навуковых прац у галіне інфарматыкі, апрацоўкі малюнкаў і распазнавання вобразаў. Распрацаваў тэорыю, метады і алгарытмы апрацоўкі і распазнавання графічных малюнкаў, прынцыпы пабудовы і методалогію стварэння аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі малюнкаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

У свеце



**787** год — адкрыццё Другога Нікейскага сабора. Сабор быў скліканы ў мэтах барацьбы супраць іканаборства, якое ўзнікла за 60 гадоў да Сабора, пры візантыйскім імператары Льве Ісаўры, які, жадаючы ліквідаваць перашкоды да мірнага суседства з мусульманамі, лічыў неабходным скасаваць шанаванне абразоў. Па выніках работ дазвалялася выкарыстоўваць у цэрквах і дамах іконы Госпада Ісуса Хрыста, Божай Маці, анёлаў і святых.

**1870** год — нарадзіўся Жорж Клод, французскі інжынер, хімік, вынаходнік неонавай лямпы (1910). Гэтае вынаходніцтва стала прымяняцца для асвятлення і стварэння светлавой рэкламы.

**1896** год — нарадзіўся Скот Фрэнсіс Фіцджэральд (1896—1940), амерыканскі пісьменнік. Аўтар раманаў «Па той бок раю», «Прыгожыя і праклятыя», «Ноч пяшчотная» і іншых.

Так гаварыў...

**КАНФУЦЫЙ:**

*«Твой дом там, дзе спакойныя твае думкі».*




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2358. Нумар падпісаны ў 19.30 23 верасня 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12